ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 86 (2139)
25 кастрычніка 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Ці на вуліцы халодны восеньскі дождж, ці завіруха — пад гэтым шкляным дахам заўсёды гарачае лета. Цвітуць гуркі, памідоры, зелянеюць пер'е цыбулі, лісточкі салаты, радыскі, стаіць густы водар кветак.

Семдзесят пяць тысяч квадратных метраў урадлівай зямлі схавана ў цяплiцах Мінскай гароднінай фабрыкі. Гэта самая буйная цяплічная гаспадарка ў рэспубліцы. Сёлета мінчане атрымалі адсюль амаль на адзін мільён рублёў гародніны і кветак.

Валянціна Далінская, якую вы бачыце на гэтым здымку; вырошчвае кветкі .Вось і зараз яна рыхтуе хрызантэмы для адпраўкі ў горад.

Фота П. НАВАТАРАВА. (БЕЛТА).

ДА НЯМЕЦКІХ СЯБРОЎ

З 4 ПА 14 ЛІСТАПАДА Ў ГДР — ДНІ САВЕЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

Дні савецкай культуры... Колькі сэрцаў нашых зарубежных сяброў радасна адгукаюцца на гэтыя словы ў афішных і газетных паведамленнях. Дні савецкай культуры сталі традыцыйнымі ў многіх краінах. І праходзяць яны заўсёды з вялікім поспехам. Колькасць прыхільнікаў у савецкай літаратуры, тэатра, кіно, музыкі няспынна расце ва ўсім свеце.

З 4 па 14 лістапада Дні савецкай культуры праводзяцца ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. У іх прыме ўдзел і Беларусь.

Для нас гэта будзе своеасаблівым адказам на Дні культуры ГДР, якія летась праходзілі ў нашай рэспубліцы і ў час якіх больш як сто прадстаўнікоў брацкай краіны пазнаёмілі беларускіх працоўных з мастацтвам сваёй краіны, з дасягненнямі ў галіне навукі, адукацыі, аховы здароўя, прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Сёлета настала наша чарга расказаць і паказаць нямецкім сябрам, як мы жывём, працуем, развіваем сваю культуру.

Працоўныя ГДР змогуць пазнаёміцца з адным з лепшых мастацкіх калектываў рэспублікі — Дзяржаўным ансамблем танца Беларусі, якім кіруе заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Аляксандр Апанасенка. Ансамбль пакажа нямецкім гледачам цікавую і разнастайную праграму — такія работы, як харэаграфічная сцэнка «Паўлінка», беларуская гумарэска «Дзед і баба», беларускія танцы «Лявоніха на кірмашы», «Лянок», рускі танец «На прызбе», украінскія, румынскія, венгерскія танцы.

Пакажуць сваё майстэрства таксама лепшыя выканаўцы інструментальнай музыкі, оперныя, балетныя і драматычныя артысты. Сярод іх народныя артысты БССР З. Бабій, Н. Давідзенка, В. Давыдаў, заслужаныя артысты рэспублікі Л. Гарэлік і І. Лакштанава, артысты філармоніі П. Чарапанаў і В. Ржэускі.

У ГДР выязджае таксама група беларускіх пісьменнікаў, кампазітараў і мастакоў: М. Ткачоў і А. Зарыцкі, Ю. Семяняка і П. Падкавыраў, А. Бембель і А. Кашкурэвіч.

У Берліне будзе дэманстравацца выстаўка графікі, шкла і фарфору. Наведвальнікі выстаўкі змогуць пазнаёміцца больш як са ста ўзорамі шкляной і фарфоравай прадукцыі заводаў імя Дзяржынскага, «Нёман» і Мінскага фарфора-фаянсавага завода.

На заводах і фабрыках, у навучальных і культурных установах ГДР адбудуцца сустрэчы нямецкіх працоўных з пасланцамі нашай рэспублікі.

Няма сумнення, што гэтыя сустрэчы яшчэ раз прадэманструюць дружбу і братэрства нашых народаў.

ПРЫСВЕЧАНА 50-ГОДДЗЮ УЗБРОЕНЫХ СІЛ СССР

Міністэрства культуры БССР і праўленне Саюза мастакоў прынялі пастанову аб арганізацыі другой рэспубліканскай мастацкай выстаўкі «На варце міру», прысвечанай 50-годдзю Узброеных Сіл СССР. Яна павінна адкрыцца ў лютым 1968 года. На ёй будуць паказаны лепшыя творы жывапісу, скульптуры, графікі, манументальнага, тэатральна-дэкарацыйнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія адлюстроўваюць гераічны шлях Узброеных Сіл СССР, іх непарыўную сувязь з народам,баявыя подзвігі савецкіх воінаў і партызан, іх высокія маральныя якасці. Галоўную ўвагу прапануецца засярэдзіць на стварэнні новых значных твораў аб сучаснай Савецкай Арміі, Ваенна-Марскім Флоце, пагранічных войсках.

Саюз мастакоў БССР, гаворыцца ў пастанове, павінен арганізаваць творчую работу мастакоў па падрыхтоўцы твораў на другую рэспубліканскую мастацкую выстаўку «На варце міру», садзейнічаць стварэнню значных тэматычных твораў, прадастаўляючы мастакам творчыя камандзіроўкі ў часці Савецкай Арміі, Ваенна-Марскога Флоту і пагранічныя войскі.

УПЭЎНЕНЫМ КРОКАМ

Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне СССР паведаміла, што работнікі прамысловасці краіны датэрмінова выканалі план III квартала і дзевяці месяцаў 1966 года па агульнаму аб'ёму вытворчасці і большасці важнейшых відаў прамысловай прадукцыі.

У параўнанні з дзевяццю месяцамі мінулага года прамысловая прадукцыя ўзрасла на 8,3 працэнта.

Пяцігодка развіцця народнай гаспадаркі краіны ўпэўнена крочыць і па нашай рэспубліцы. Пра гэта яскрава сведчаць лічбы паведамлення Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР «Аб выніках выканання Дзяржаўнага плана прамысловасцю Беларусі за дзевяць месяцаў 1966 года».

Вось яны, гэтыя лічбы росту, лічбы нашага руху наперад.

План III квартала і дзевяці месяцаў 1966 года па агульнаму аб'ёму вытворчасці і большасці важнейшых відаў прамысловай прадукцыі выканан датэрмінова.

Прырост вытворчасці прамысловай прадукцыі за дзевяць месяцаў у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года склаў 14 працэнтаў.

План дзевяці месяцаў па агульнаму аб'ёму вытворчасці ў цэлым па рэспубліцы выкананы на 105 працэнтаў; прамысловасць, падведамасная Савету Міністраў БССР, выканала план на 106 працэнтаў.

За гэтымі лічбамі — мільёны кілават-гадзін электраэнергіі, сотні тысяч тон мінеральных угнаенняў, тысячы трактараў і аўтамашын.

Адна з цэнтральных задач пяцігадовага плана — рэзкае павелічэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання. Гэтая задача паспяхова ажыццяўляецца. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года выпуск баваўняных, ільняных, шарсцяных і шаўковых тканін павялічыўся на 10,2 мільёна квадратных метраў, швейных вырабаў — на 27,5 мільёна рублёў, скуранога абутку — амаль на два мільёны пар, тэлевізараў — на 30,4 тысячы штук і г. д.

Адзін з галоўных крытэрыяў работы кожнага прадпрыемства цяпер — узровень прадукцыйнасці працы, сабекошт прадукцыі. І тут паказчыкі радуюць. Выканан дзевяцімесячны план росту прадукцыйнасці працы і зніжэння сабекошту прамысловай прадукцыі.

Як паведамляе ЦСУ, у трэцім квартале працягваўся перавод прамысловых прадпрыемстваў на новую сістэму планавання і эканамічнага стымулявання. Прадпрыемствы, якія працуюць у новых умовах, перавыканалі павышаныя планы па рэалізацыі прадукцыі і прыбытках.

Пяцігодка набірае тэмпы, пяцігодка паскарае свой разбег.

Кніжны магазін № 5 г. Бабруйска нядаўна атрымаў новае, светлае памяшканне.

Фота Ул. КРУКА.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

КАМПАЗІТАРЫ РЫХТУЮЦЦА ДА З'ЕЗДА

Адбылося пасяджэнне праўлення Саюза кампазітараў БССР, прысвечанае падрыхтоўцы да пятага з'езда кампазітараў рэспублікі. З'езд адбудзецца з 12 па 17 лістапада і пачнецца серыяй канцэртаў з твораў беларускіх кампазітараў. На сімфанічных канцэртах прагучаць Восьмая сімфонія М. Аладава, Другая сімфонія Л. Абеліёвіча, Трэцяя сімфонія Я. Глебава, Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Г. Вагнера, Канцэрт для кантрабаса з аркестрам А. Багатырова, Канцэрт для органа з аркестрам А. Янчанкі. Удзельнікі з'езда пазнаёмяцца таксама з паэмай для голасу і аркестра «Попел» С. Картэса, Канцэртам № 2 для скрыпкі з аркестрам Д. Камінскага, Канцэртам для фартэпіяна з аркестрам Р. Бутвілоўскага, Харэаграфічнымі навеламі Я. Глебава.

Адзін з канцэртаў адбудзецца ў калгасе «Новы быт» Мінскага раёна. Песні і інструментальныя творы разам з удзельнікамі з'езда будуць ацэньваць працаўнікі палёў. Спецыяльны канцэрт беларускай дзіцячай музыкі адбудзецца ў музычнай школе аўтазавода.

У канцэртах прымуць удзел сімфанічны аркестр, аркестр народных інструментаў, народны хор БССР, акадэмічная харавая капэла, эстрадны аркестр радыё і тэлебачання, салісты тэатра оперы і балета, філармоніі.

На з'езд маюць прыехаць віднейшыя дзеячы музычнай культуры з братніх рэспублік.

ПАВЕЛ КАРЧАГІН НА ОПЕРНАЙ СЦЭНЕ

У студэнцкай опернай студыі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі багаты «паслужны спіс». Тут ішлі «Алека», «Царская нявеста», «Утаймаванне свавольніцы». А зараз на змену класічным оперным героям прыйдзе сучасны. Студэнты вырашылі паставіць оперу беларускага кампазітара П. Падкавырава «Павел Карчагін». Хоць опера напісана ўжо даўно, на сцэне яна не ішла. Аўтар працягвае работу над творам. Студэнты сустрэліся з кампазітарам, абмеркавалі асаблівасці пастаноўкі.

Спектакль мяркуецца паказаць у красавіку наступнага года. Прайшло ўжо застольнае чытанне, пачаліся спеўкі. Ставіць оперу рэжысёр М. Сярдобаў, мастак — І. Санін, дырыжор — Ю. Новікаў.

Сваю работу студыйцы прысвячаюць пяцідзесяцігоддзю Савецкай улады.

СУСТРЭЧЫ З ГЛЕДАЧАМІ

Самадзейныя артысты Уваравіцкага дома культуры — частыя госці хлебаробаў Буда - Кашалёўскага раёна. Яны выступалі ў Дуравічах, Глазаўцы, Скепні, Цярэнічах, Чабатовічах і іншых вёсках. І ўсюды іх звонкія песні, танцы ўзнагароджваюцца апладысментамі. Гледачы запрашаюць самадзейных артыстаў часцей прыязджаць да іх з канцэртамі.

Найбольшы поспех — ва ўдзельнікаў танцавальнага калектыву, у якім 16 юнакоў і дзяўчат. Імі кіруе настаўнік сярэдняй школы Канстанцін Якаўцоў. У рэпертуары калектыву — беларускія народныя танцы, танцы народаў Савецкага Саюза.

Хораша выконваюць беларускія народныя песні Уладзімір Кірылін і Ларыса Шаўцова. Актыўныя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Дома культуры механізатары Уладзімір Кабрусёў, Мікалай Грыцкоў, Уладзімір Эйсмант, рабочы харчкамбіната Юрый Герчыкаў і многія іншыя.

Зараз самадзейныя калектывы Дома культуры рыхтуюць новыя канцэртныя праграмы да ўсесаюзнага фестывалю.

ПА ЗАПРАШЭННЯХ

У адрас Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў гэтыя дні паступаюць заяўкі ад працоўных рэспублікі на перадсвяточныя канцэрты. Артысты склалі план абслугоўвання і пачалі яго выконваць. У Брэсцкую вобласць выехала брыгада, якую узначальвае М. Пісьман. Днямі выязджаюць брыгады для абслугоўвання працоўных Маладзечна, Жодзіна, Салігорска. На гэтым тыдні адбудуцца канцэрты артыстаў філармоніі ў палацах культуры буйнейшых прадпрыемстваў сталіцы — камвольнага камбіната, чыгуначнага вузла, мэблевай фабрыкі. Па запрашэнню нашых украінскіх сяброў у Данецкую вобласць выехала група артыстаў на чале з В. Сінайскім.

Універсітэты ў калгасах

Мінская абласная народная філармонія, Беларуская дзяржаўная кансерваторыя і абласны Дом народнай творчасці адкрылі ў калгасах імя Калініна Мінскага раёна і «Ленінскі шлях» Смалявіцкага раёна музычныя універсітэты культуры.

У праграме ўніверсітэтаў — лекцыі і канцэрты, прысвечаныя развіццю беларускай музыкі, беларускай народнай песні, сімфанічным і камерна-інструментальным творам. У гасцях у калгаснікаў пабываюць А. Багатыроў, А. Падкавыраў, Д. Смольскі, І. Лучанок.

Першая лекцыя ўжо адбылася ў калгасе імя Калініна. Яе прачытала студэнтка факультэта кампазіцыі і музыказнаўства кансерваторыі Л. Язерская.

ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ СЛУХАЧОЎ

«Калі гэта трэба для «галачкі», дык мы аўдыторыю дадзім, але майце на ўвазе: нам такія мерапрыемствы не патрэбны»...

Такое Нона Смольская пачула, калі ўпершыню прапанавала дырэктару адной з мінскіх школ прачытаць лекцыю па музыцы.

А цяпер у дзіцячым аддзеле гарадской нотна-музычнай бібліятэкі адбою няма ад «кліентаў». Заяўкі на лекцыі цяпер прымаюцца ўжо на студзень.

У бібліятэцы багатая фанатэка, свой прайгравальнік, цікавыя ілюстрацыі. З «пераносная гаспадаркай» бібліятэкары прыходзяць у школы і выступаюць пасля заняткаў. Разам з Нонай у рабоце актыўна ўдзельнічаюць Марына Фелер, Іна Жданові.

Да пяцідзесяцігоддзя Савецкай улады бібліятэкары падрыхтавалі цыкл лекцый: «Музыка ў жыцці Ул. І. Леніна», «Песні рэвалюцыі і грамадзянскай вайны», «Ішла вайна народная», «Нашы піянерскія песні».

Нона Смольская накіроўваецца на чарговую лекцыю.

СТВОРЫМ ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ

У нашу рэдакцыю працягваюць паступаць водгукі на пісьмо групы дзеячоў культуры «Створым этнаграфічны музей», што было змешчана ў газеце 23 жніўня г. г. Друкуем некаторыя з іх.

ЭТНОГРАФЫ ГАЛАСУЮЦЬ «ЗА»

Адразу скажам: пісьмо групы дзеячоў культуры, літаратуры і мастацтва аб стварэнні ў Беларусі этнаграфічнага музея пад адкрытым небам асабліва, мусіць, усхвалявала нас, вучоных-этнографаў, і мы лічым сваім святым абавязкам выказаць калектыўную думку аб гэтай прапанове.

Што і казаць, яна своечасовая і патрэбная! Такой рэспубліцы, як наша, час ужо мець этнаграфічны музей, і мы галасуем за яго стварэнне, як кажуць, абедзвюма рукамі. Сапраўды, у Мінску ёсць некалькі розных музеяў, у кожным абласным і найбольш буйных раённых гарадах Беларусі створаны і плённа працуюць краязнаўчыя музеі. І толькі да гэтага часу мы не маем этнаграфічнага музея, такога важнага, неабходнага цэнтра, у якім бы ў натуры быў праўдзіва адлюстраваны матэрыяльны і духоўны быт беларускага народа, яго трансфармацыя ў бок паляпшэння, збліжэння з гарадскім бытам за гады Савецкай улады.

...Успамінаюцца сустрэчы і карціны, з якімі даводзілася сустракацца некаторым з нас у час сёлетніх экспедыцый і паездак па Беларусі. У рабочым пасёлку станцыі Чавусы Магілёўскай вобласці дзядзька пілаваў дровы. Раптам са сваім сынам на козлы ён узваліў... ступу. Звычайную сялянскую ступу, якая праслужыла яму, пэўна, з паўстагоддзя. Апошнія гадоў дзесяць яна валялася пад павеццю, трухлела, замінала гаспадару. І вось трапілася пад руку, на козлы і была распілавана на тры кавалкі.

— Навошта вы яе распілавалі? Ці дроў не хапае?

— Аджыла сваё, валяецца, толькі перашкаджае, — адказаў дзядзька. — А так вось дні на два печ паліць хопіць.

У адной з вёсак Ушацкага раёна ў калгасніка пад страхой хлява стаялі разабраныя кросны. Іх мылі дажджы, засыпаў снег, сушыла сонца — адным словам, прырода рабіла сваю няўмольную справу. Пацікавіліся ў гаспадыні, чаму такая няўвага да кроснаў, якія, відаць, былі некалі патрэбны.

— Ад бабулі нам засталіся. У вайну і пасля вайны яшчэ крыху ткала. А цяпер навошта яны? — гаворыць калгасніца. — У краме колькі хочаш мацерыі. Якой хочаш. Усё не магу дапрасіцца, каб гаспадар пасек на дровы.

На Случчыне мы размаўлялі са старшынёй аднаго калгаса. Гаспадарка, якую ён узначальвае, сярэдняя ў раёне, але яна ўпэўнена і шпарка набірае ў апошнія гады тэмпы ў развіцці эканомікі і культуры. Старшыня — чалавек з вышэйшай адукацыяй, разумее і бачыць перспектывы развіцця свайго калгаса. Размаўляліся і аб рэканструкцыі вёсак арцелі.

— Старое ламачча руйнуем бульдозерамі, зносім, а ставім новыя дамы, — гаварыў, узнёсла старшыня. — Вунь цэлую вуліцу з новых дамоў паставілі, а дамы якія — любавацца толькі.

Старшыня казаў праўду: дамы і сапраўды добрыя, са светлымі вокнамі, на некалькі пакояў, пад шыферным і гонтавымі дахамі. Гаварыў аб усім гэтым старшыня, паказваў нам вёску, і сэрца наша радавалася. Але ў той жа час іншая думка не давала спакою: а чаму ж мы такія нядбайныя да жывой гісторыі народа? Выказалі старшыні вось такую думку: а чаму б не пакінуць старую хату ў якасці мясцовага музея, чаму б не сабраць у ёй рэчы, адзенне і прылады, якімі карысталіся вакольныя сяляне ў мінулым? Старшыня задумаўся і заўважыў:

— Праўду кажаце, а мы неяк аб гэтым і не думалі.

...Не думалі... Яно так і ў сапраўднасці: не ўзнікала раней такая думка аб стварэнні этнаграфічнага музея пад адкрытым небам. Урэшце, можна пейк гэта зразумець: не да гэтага было, у першую чаргу думалі пра хлеб надзённы, залечвалі раны вайны. Цяпер жа настаў час падумаць самым сур'ёзным чынам аб адкрыцці такога музея.

Мы невыпадкова ўзялі тры невялікія прыклады з жыцця розных куткоў рэспублікі. Яны лепш за самыя ўзнёслыя словы гавораць аб тым, як увачавідкі мяняецца аблічча вёсак і пасёлкаў, хатні быт рабочых і калгаснікаў, як назаўсёды знішчаецца старое — нямыя сведкі гісторыі. «Мы не можам і не павінны забываць свайго ўчарашняга. Нам трэба ўсяляк клапаціцца аб тым, каб наша гісторыя не загінула, не знікла бясследна», — усхвалявана пісалі аўтары пісьма «Створым этнаграфічны музей». Мы поўнасцю падзяляем іх трывогу, іх заклапочанасць. Сапраўды, праз колькі гадоў у вёсцы немагчыма будзе знайсці старых рэчаў — адзення, прылад, пабудоў. Яны знікнуць. Трэба зараз жа, неадкладна брацца за стварэнне музея.

Вельмі важным здаецца нам пытанне аб размяшчэнні музея. Такое месца павінна мець не толькі характэрны беларускі пейзаж, ландшафт, добрыя пад'езды, але і быць недзе ў цэнтры рэспублікі, на скрыжаванні, калі можна так сказаць, усіх дарог.

Вельмі важным здаецца нам і тое, каб пры стварэнні музея, пры зборы матэрыялаў для яго экспазіцый збіраліся і матэрыялы, прысвечаныя быту беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, які жыў і мужна змагаўся з фашысцкімі захопнікамі. Гэты аспект матэрыяльнай культуры нашага народа, на жаль, не адлюстраваны ні ў адным з музеяў рэспублікі.

А. Залескі, загадчык сектара этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Міністэрства культуры БССР, доктар гістарычных навук; **В. Бандарчык,** старшы навуковы супрацоўнік, доктар гістарычных навук; **Ул. Іваноў, Л. Малчанава, І. Корзун, Р. Надольскі, Л. Мінько,** старшыя навуковыя супрацоўнікі, кандыдаты гістарычных навук; **Г. Мярзлова, А. Дупеба, А. Шастаков, А. Мялешка, А. Камароў, У. Гуркоў,** навуковыя супрацоўнікі.

СПРАВА ВАЖНАЯ

Некалькі гадоў назад мне давялося пабываць у Румыніі. Перш, чым пазнаёміць з краінай, румынскія сябры сказалі:

— Дарагі таварыш, мы пазнаёмім вас спачатку з мінулым нашай Румыніі, не выязджаючы з Бухарэста.

На адной з ваколіц сталіцы мы зайшлі ў цудоўны парк вікавых дрэў. Тут на некалькіх дзесятках гектараў размясціўся этнаграфічны музей, у якім сабраны ўзоры дэкаратыўнага мастацтва, архітэктурных пабудоў, пачынаючы ад сялянскага двара і канчаючы старажытнымі драўлянымі цэрквамі, вопраткі і касцюмы своеасаблівага крою з разнастайным арнаментам, абутак, сельскагаспадарчыя прылады, зброя, мэбля, начынне, — звезеныя сюды з усіх правінцый Румыніі...

Пасля мой румынскі сябар сказаў:

— Так жылі нашы продкі ў XVIII і XIX стагоддзях, а цяпер паедзем у сённяшнюю Румынію!..

І ў такім супастаўленні яшчэ ярчэй стала відаць тое новае, што ёсць сёння ў краіне. Вось што дае этнаграфічны музей.

Стварэнне этнаграфічнага музея ў Беларусі—справа важная і патрэбная, асабліва для маладога пакалення.

У этнаграфічным музеі павінны быць прадстаўлены ўсе этнаграфічныя асаблівасці Беларусі— архітэктура Падняпроўя, Прыдзвіння, Наднямоння, беларускае Палессе і цэнтр Беларусі — Міншчына. Тут павінны быць сабраны ўзоры архітэктуры, дэкаратыўнага мастацтва, прыкладных мастацкіх вырабаў, адзення, арнаменту, сельскагаспадарчых прылад, рыбацкіх снасцей, інструменту беларускіх рамеснікаў— кавалёў, сталяроў, цесляроў, слесараў, рымараў, іхнія майстэрні, прылады плытагонаў, лесарубаў, сялян — земляробаў і жывёлаводаў... Усё гэта, сабранае ў адно месца, павінен убачыць чалавек, — і малады, і стары, каб лепш ведаць гісторыю і побыт свайго краю, сваёй радзімы, за якую змагалася не адно пакаленне.

Іларыён БАРАШКА.

г. Масква.

НЕАБХОДНЫ!

Час шпарка наступае на тое, што аджыло. Дажываюць свой век старыя сялянскія хаты, выходзяць з ужытку і знікаюць бясследна старыя хатнія і гаспадарчыя прылады, адзенне, абутак і г. д. А між тым быт народа—таксама цікавейшы і своеасаблівы кавалак гісторыі. Як наогул неабходна вывучаць гісторыю, так і да этнаграфіі трэба адносіцца з павагай і ні ў якім разе не пагарджаць ёю. Трэба, каб пра мінулы быт беларуса ведалі нашчадкі. Таму стварэнне этнаграфічнага музея павінна быць самай надзённай справай. Інакш можна спазніцца і тым самым абкрасці саміх сябе і тых, хто прыйдзе на змену нам.

Некаторыя таварышы могуць сказаць, што этнаграфію беларусаў можна прадставіць у краязнаўчых музеях. Правільна, такія аддзелы ёсць і будуць у краязнаўчых музеях. Але... Тут музейныя работнікі зразумеюць мяне асабліва, бо ім вядомы тыя цяжкасці, з якімі сутыкаешся кожны раз, калі думаеш, як паказаць на параўнальна невялікай экспазіцыйнай плошчы этнаграфію краю. У лепшым выпадку можна паказаць куточак хаты з імітаванай вясковай печчу і начыннем, развесіць некалькі посцілак розных узораў, расставіць некаторы сельскагаспадарчы рыштунак, павесіць яшчэ на сцяне пастухову берасцяную дудку. Вось і ўсё. А як паказаць сапраўдную гаспадарку селяніна: яго хату, хлеў, ток, павець, шнурок зямлі і г. д.?

Наглядна паказаць натуральную сялянскую гаспадарку беларуса, якой яна была на працягу стагоддзяў, можна толькі ў этнаграфічным музеі пад адкрытым небам. Такі музей проста неабходны! Будзем спадзявацца, што справа з яго стварэннем будзе вырашана станоўча. Нашчадкі скажуць нам шчырае дзякуй.

Г. КАХАНОЎСКІ,
навуковы супрацоўнік
Мінскага абласнога
краязнаўчага музея.

г. Маладзечна.

З ВЫСТАЎКІ МАЛАДЫХ МАСТАКОЎ



Ул. ХМЫЗНІКАЎ. «Галоўны абвінаваўца» (гіпс).

КРОКІ ФЕСТЫВАЛЮ

КАРЫСНЫ СЕМІНАР

У Гомельскім абласным Доме народнай творчасці сем дзён праходзіў семінар кіраўнікоў харавых і танцавальных калектываў самадзейнасці. 75 чалавек пад кіраўніцтвам вопытных метадыстаў з Гомеля, Мінска і Кіева развучвалі новыя танцы і песні, знаёміліся з методыкай работы, падбіралі рэпертуар.

У рабоце семінара ўдзельнічалі прадстаўнікі ўсіх раёнаў Гомельскай вобласці. І, здавалася б, з размоў з імі можна будзе скласці карціну падрыхтоўкі да фестывалю. Але гэтага не здарылася, хоць размова і адбылася — вялікая і, мне здаецца, шчырая. Справа ў тым, што большасць удзельнікаў семінара яшчэ не знаёма з палажэннем аб фестывалі. Калі гаворка зайшла пра святочную праграму, яны, у лепшым выпадку, маглі толькі назваць некалькі танцаў або песень і ніхто (апроч кіраўніка Петрыкаўскага народнага хору І. Каленніка) не сказаў пра стварэнне сюжэтнай праграмы, прадугледжанай палажэннем. Большасць культработнікаў рыхтуецца да фестывалю як да звычайнага агляду, не клапоцячыся ні пра рэпертуар, ні пра майстэрства. Ва ўсіх спасылкі на цяжкасці — маўляў, няма нотаў, няма кіраўнікоў. І ў той жа час ніводзін раён да гэтага часу не звярнуўся ў Дом народнай творчасці, не папрасіў прысласць метадыста. А ў Гомелі за апошні час пабывала некалькі беларускіх кампазітараў і метадыстаў рэспубліканскага Дома народнай творчасці, якія ахвотна выехалі б у любы раён.

На жаль, на месцах не праяўляюць ініцыятывы. Нядаўна па камандзіроўцы абласнога Дома народнай творчасці ў Юравіцкі народны хор выязджала выкладчыца музычнага вучылішча, каб дапамагчы падабраць рэпертуар і развучыць яго. За тры дні кіраўнікі хору і Калінкавіцкі аддзел культуры не здолелі нават сабраць удзельнікаў самадзейнасці. Камандзіроўка не дала карысці.

Гутарка з удзельнікамі семінара паказала, што амаль усе яны вельмі мала цікавяцца работай сваіх калег — кіраўнікоў іншых гурткоў мастацкай самадзейнасці, лічаць, што за гэта адказвае толькі мастацкі савет і раённы аддзел культуры.

Задаволены семінарам засталіся работнікі прафсаюзных клубаў — за апошнія гады іх упершыню запрасілі на вучобу. Гэта вельмі радасны факт — абласное ўпраўленне культуры і Дом народнай творчасці пачалі паспяхова пераадольваць ведамасныя бар'еры. На семінары вырашана праводзіць сумесныя конкурсы на лепшы палітычны плакат, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады і 100-годдзю з дня нараджэння Ул. І. Леніна, арганізоўваць сумесныя выстаўкі самадзейных мастакоў.

У лістападзе на Гомельшчыне пачынаюцца раённыя агляды. Семінар нямала зрабіў для таго, каб яны прайшлі паспяхова.

Д. РАДЗІНСКІ,
кар. «Літаратуры і мастацтва».

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

У тэатры імя Якуба Коласа адбылася прэм'ера новага спектакля па п'есе А. Маўзона «У доме на Сонечнай». Паставіў спектакль заслужаны артыст Казахскай ССР А. Падабед, мастак — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Я. Нікалаеў, музычнае афармленне Б. Насоўскага. У спектаклі заняты народныя артысты БССР А. Шэлег, А. Радзялоўская, М. Звездачотаў, Ф. Шмакаў, заслужаная артыстка З. Канапелька, артысты Г. Маркіна, Ул. Куляшоў, Н. Левашова і іншыя.

Спектакль цёпла прыняты гледачамі.

На здымку: Шыбанаў — А. Шэлег, Валя — Г. Маркіна.

Фота С. КОХАНА.

СЁННЯ СТУДЭНТ — ЗАЎТРА БІБЛІЯТЭКАР

НАТАТКІ АБ РАБОЦЕ БІБЛІЯТЭЧНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

Штогод у нашу бібліятэчную сям'ю ўліваецца новы атрад маладых спецыялістаў, якія скончылі бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута і Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Толькі летась бібліятэчны факультэт педінстытута закончылі 63 маладыя спецыялісты дзённага аддзялення, 38 вячэрняга, 71 завочнага. Сярод іх нямала сапраўдных энтузіястаў, якія з першых крокаў сваёй практычнай дзейнасці паказалі сябе добрымі спецыялістамі.

На жаль, не ўсе маладыя спецыялісты ідуць на работу з глыбокімі ведамі, узброеныя практычнымі навыкамі.

Мне тройчы давялося быць старшынёй дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, і часам было вельмі балюча слухаць бездапаможныя адказы некаторых студэнтаў як па гісторыі КПСС, рускай літаратуры, так і па спецыяльных прадметах.

Знаёмства з работай бібліятэчнага факультэта педінстытута выклікала ў мяне думкі, якімі я хачу падзяліцца з чытачамі.

Некалькі слоў аб вытворчай практыцы студэнтаў. Гэта пытанне надзвычай важнае, бо іменна ў час практыкі студэнт набывае першыя навыкі, ён пасапраўднаму пазнае сваю будучую прафесію.

Памагчы будучаму спецыялісту правільна выбраць профіль і напрамак у сваёй рабоце абавязаны не толькі выкладчыкі інстытута, якія кіруюць практыкай, але і работнікі базавых бібліятэк. Ці заўсёды так бывае? На жаль, не. Нават тады, калі студэнт трапляе на практыку ў лепшую бібліятэку рэспублікі, яе работнікі (асабліва масавых бібліятэк) вельмі занятыя. І вось добрыя спецыялісты замест таго каб раскрыць студэнту-практыканту тайны важнай і складанай бібліятэчнай справы, пачынаюць «выдаваць» яму пэўнымі дозамі тэхнічную работу.

Ад нас, бібліятэчных работнікаў, многае залежыць, каб практыка студэнтаў прайшла цікава, з карысцю для іх. Упэўнена, што калі б кіраўнікі факультэта больш аддавалі ўвагі базавым бібліятэкам, праводзілі канферэнцыі, кіраўнікоў практыкі па абмену вопытам, дык кожная практыка студэнтаў давала б значна больш вынікаў. І, вядома, выкладчыкі, якія кіруюць практыкай студэнтаў, асабліва чацвёртага курса, павінны мець магчымасць выязджаць на базы практыкі не адзін-два разы, а часцей. Пакуль што толькі студэнты, якія праходзяць практыку ў нашай і Мінскай абласной бібліятэках, маюць магчымасць часта бачыць сваіх выкладчыкаў, якія кіруюць практыкай.

Каб выпускнік інстытута адчуваў сябе больш падрыхтаваным да практычнай работы, трэба на чацвёртым курсе ўвесці абавязковую спецыялізацыю. Студэнты, якія пойдуць працаваць у навуковыя бібліятэкі, будуць знаёміцца са спецыфікай работы навуковых бібліятэк, і, напэўна, вытворчую практыку яны таксама павінны праходзіць у гэтых культурна-асветных установах. Студэнты, якія будуць працаваць у дзіцячых бібліятэках, абавязаны прайсці практыку і вывучыць спецыфіку работы бібліятэк гэтага профілю.

Увогуле было б няблага часцей пасылаць выкладчыкаў бібліятэчнага факультэта (асабліва кафедры бібліятэказнаўства) на ўсесаюзныя і рэспубліканскія нарады і семінары бібліятэчных работнікаў, даваць ім магчымасць удзельнічаць у брыгадах, якія вывучаюць вопыт лепшых бібліятэк Беларусі. Гэта прынесла б двайную карысць — і бібліятэкарам-практыкам, і выкладчыкам.

Веданне жыцця, веданне работы бібліятэк рэспублікі і краіны намнога ўзбагаціла б курс, які чытае той ці іншы выкладчык бібліятэчнага факультэта. Тады і студэнты глыбей пазналі б спецыфіку работы бібліятэк Беларусі і не было б тых прыкрых фактаў, якія мелі месца на дзяржаўных экзаменах па бібліятэказнаўству. Студэнт адказвае нядрэнна па білету і адразу губляецца, калі задаеш пытанне, якое датычыць практыкі работы бібліятэк рэспублікі.

Хацелася б, каб выкладчыкі інстытута глыбей і больш цесна былі звязаны з Міністэрствам культуры рэспублікі, Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя Леніна, рэспубліканскім міжведамасным саветам, каб яны, як кажуць, задавалі тон у бібліятэчным жыцці Беларусі.

Летась мне давялося ўдзельнічаць у другой рэспубліканскай канферэнцыі бібліятэчных работнікаў братняй Літвы. І было радасна слухаць цікавыя даклады, прачытаныя выкладчыкамі бібліятэчнага факультэта Вільнюскага універсітэта. У Літве гэтыя выкладчыкі прымаюць актыўны ўдзел ў распрацоўцы важнейшых праблем бібліятэказнаўства і бібліяграфіі.

У нас у рэспубліцы за апошнія гады кантакты бібліятэчнага факультэта, Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна і Міністэрства культуры БССР прыкметна актывізаваліся. Будзем спадзявацца, што яны будуць самымі актыўнымі ўдзельнікамі навуковай канферэнцыі бібліятэчных работнікаў рэспублікі, прысвечанай 50-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Зыходзячы з назіранняў, зробленых у час дзяржаўных экзаменаў, мне хацелася б звярнуць увагу яшчэ на некаторыя моманты, а іменна: на экзаменах па літаратуры і па спецыяльных прадметах варта было б больш увагі аддаваць пытанням беларускай літаратуры і бібліятэчнай справы рэспублікі.

Студэнты, якія заканчваюць бібліятэчны факультэт Мінскага педінстытута, здаюць экзамены па рускай літаратуры. У білеце значацца тры пытанні: адно па рускай класічнай літаратуры, другое — па савецкай літаратуры і трэцяе — па старажытнарускай. І ніводнага пытання па беларускай літаратуры. Мне пярэчылі: «Экзамен жа па рускай літаратуры». Але нельга забываць таго, што мы жывём і працуем у Беларусі. Дарэчы тут нагадаць і вопыт старэйшага ў краіне Харкаўскага бібліятэчнага інстытута. Там на дзяржаўных экзаменах трэцяе пытанне білета — па ўкраінскай літаратуры. Напэўна, такое стаўленне да роднай літаратуры ў Мінскім педінстытуце з'яўляецца адной з прычын таго, што многія нашы студэнты слаба ведаюць беларускае мастацкае слова, не могуць назваць навінак, не ведаюць нават вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Вынікі гэтага мы адразу адчуваем, калі малады спецыяліст прыязджае на работу. Ён дрэнна прапагандуе беларускую літаратуру, бо не ведае яе.

Мне прыгадваецца адзін факт, пра які я не магу маўчаць. Студэнтка-завочніца Г. адказвала па білету, у якім было пытанне: «Вобраз станоўчага героя ў савецкай літаратуры праслаўленных год». Матэрыял яна ведала слаба, але ўсё ж сёе-тое гаварыла. Калі ж у яе спыталі: а якое адлюстраванне гэтая тэма знайшла ў беларускай літаратуры, яна зусім нічога не магла адказаць.

Мне здаецца, што гэта пытанне варта сур'ёзнай увагі, і кафедра літаратуры разам з кіраўніцтвам інстытута павінны прыняць дзейсныя меры, каб выправіць такое становішча.

У час вучобы выкладчыкі літаратуры бібліятэчнага факультэта павінны больш увагі звяртаць на выпрацоўку ў студэнтаў здольнасці самастойна ацэньваць як літаратурныя з'явы, так і асобныя творы. Іншы раз студэнт на дзяржаўных экзаменах добрасумленна пераказвае змест таго ці іншага твора, але зусім не ўмее аналізаваць яго. Як жа такі малады спецыяліст будзе прапагандаваць гэты твор сярод чытачоў, калі ён сам не можа правільна прааналізаваць яго?

Жыццё падказвае, што пара перадаць бібліятэчны факультэт у падпарадкаванне Міністэрства культуры рэспублікі. Тады былі б больш апраўданыя і сувязь і патрабавальнасць. Тады і да размеркавання маладых спецыялістаў Міністэрства культуры БССР ставілася б больш уважліва. У нас яшчэ вялікая патрэба ў бібліятэчных кадрах з вышэйшай адукацыяй. Аднак заяўкі абласных упраўленняў культуры цалкам не выконваюцца, вельмі многа маладых спецыялістаў штогод едуць на работу за межы рэспублікі.

У гэтым артыкуле я закранула толькі некаторыя пытанні падрыхтоўкі бібліятэкараў у рэспубліцы. Хацелася, каб зацікаўленыя арганізацыі і ўстановы зрабілі ўсё неабходнае, каб у навучальных установах рыхтаваліся сапраўды высокаадукаваныя работнікі бібліятэк, добрыя знаўцы сваёй справы.

І. САНКОВА,
намеснік дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна.

ФЕМІДА З РАЗВЯЗАНЫМІ ВАЧЫМА

— ПРЫЗНАЦЬ вінаватым у злосным хуліганстве, якое выявілася ў выключным цынізме, у супраціўленні работнікам міліцыі, звязаным з гвалтам; у знявазе работнікаў міліцыі пры выкананні імі абавязкаў па ахове грамадскага парадку, і на аснове арт. 201 частка II КК БССР пазбавіць волі тэрмінам на 2 гады.

Яго ж па арт. 187-1 частка II КК БССР пазбавіць волі тэрмінам на 3 гады.

Яго ж па арт. 188-1 КК БССР пазбавіць волі тэрмінам на 6 месяцаў...

Голас суддзі гучаў урачыста і сурова.

— Па сукупнасці артыкулаў, у сілу арт. 39 КК БССР выбраць Сярмяжку А. І. меру пакарання ў выглядзе трох гадоў пазбаўлення волі...

У зале, дзе да гэтага стаяла напружаная цішыня, пачуўся шум адабрэння.

Суддзя перачакаў шум і ўжо іншым голасам закончыў:

— Але, прымяняючы артыкул 43 КК БССР, лічыць пакаранне на гэты тэрмін умоўным з выпрабавальным тэрмінам — 5 год...

Вось такім прыгаворам закончыўся суд над А. І. Сярмяжкам. Прыгаворам, які сваёй нечаканай мяккасцю здзівіў і абурыў амаль усіх, хто быў знаёмы з гэтай крымінальнай справай.

І было чаго здзіўляцца, было чым абурацца. Але раскажам усё па-парадку.

Увечары шостага сакавіка гэтага года старшыня Капыльскага раённага камітэта прафсаюза рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак А. І. Сярмяжка ўчыніў п'яны дэбош у рэстаране.

Спачатку ён грукаў кулакамі па стале і патрабаваў яшчэ гарэлкі, потым, калі гарэлкі яму ўсё ж такі не далі (час быў позні), палез у бойку з поварам — парваў на ім халат, брыдка аблаяў прысутных — буфетчыцу, гардэробшчыцу, афіцыянтак, і, нарэшце, прафсаюзны дзеяч тут жа ў зале зрабіў тое, што звычайна людзі робяць у месцах, спецыяльна для гэтага адведзеных.

Міліцэйскі патруль, які якраз надарыўся на гэтую мінуту, памкнуўся даставіць дэбашыра ў аддзяленне міліцыі. Сярмяжка тут жа паабяцаў сарваць з міліцыянераў пагоны, бо «такога яшчэ не было, каб начальства забіралі ў міліцыю».

Потым «начальства» паказала, што ў яго ёсць моцныя кулакі і зубы. Гэта неўзабаве адчуў начальнік патруля аперупаўнаважаны міліцыі А. Ждановіч. Сярмяжка стукнуў яго некалькі разоў кулаком па твары, а потым, калі яго ўсё ж такі прывялі ў аддзяленне, ухітрыўся дастаць Ждановіча яшчэ і нагой...

Здавалася, што фінал усяго гэтага няцяжка прадбачыць — заўзятага хулігана арыштуюць, а потым пакараюць згодна з нашымі законамі.

Атрымалася ж інакш. Неўзабаве ў рух былі прыведзены сілы, пра існаванне якіх раней і здагадацца было цяжка. І ўся гэта «гісторыя» з'явілася для многіх выпрабаваннем на прынцыповасць. Яна ўзняла пытанні, на якія, здаецца, даўно і катэгарычна адказана і якія, тым не менш, для некаторых людзей яшчэ існуюць.

А. А. Шкрэда, следчы міліцыі, які ў той дзень дзяжурыў па аддзяленню, расказваў мне, што, калі прывялі Сярмяжку, ён яшчэ доўга буяніў і лаяўся брыдкімі словамі. Раптам нехта сказаў, што ён муж намесніка старшыні райвыканкома Таісіі Ільінічны Сярэнка. І тут, па словах следчага, у яго застукала сэрца і ён падумаў: навошта звязвацца з начальствам? І загадаў адразу пазваніць ёй на кватэру. Гэта было ўжо ў сярэдзіне ночы. Таісія Ільінічна аблаяла міліцыянераў, чаму адразу ёй не паведамілі, і сказала, каб адпусцілі яе мужа дадому. Так і зрабілі.

Я слухаў Шкрэду — гэта малады яшчэ чалавек гадоў дваццаці пяці — дваццаці шасці — і думаў: хутка ж ты, даражэнькі, засвоіў «ісціну» — супраць начальства не станавіся.

А ён, нібы прачытаўшы мае думкі, з гатоўнасцю дадае, што ўжо аднойчы меў непрыемнасць — пачаў даследаваць справу, а ў ёй, аказваецца, замешаны «адзін раённы таварыш...» А Шкрэда ў той момант без кватэры быў... Ледзь выблытаўся з гісторыі...

...Да галоўнага ўрача Капыльскай раённай бальніцы Антона Яўгенавіча Брыкальскага я прыйшоў, каб высветліць некалькі пытанняў. Праз дзень ці два пасля інцыдэнту Сярмяжка лёг у бальніцу (у яго рэўматызм неактыўнай формы). Тут, у бальніцы, яго наведаў следчы абласной пракуратуры (справа неўзабаве была перададзена ў абласную пракуратуру) Н. Станілевіч. У час допыту (стан хворага па вызначэнню ўрачоў даваляў гэта рабіць) у палату ўварвалася ў паліто Сярэнка і запатрабавала ў катэгарычнай форме, каб следчы спыніў «здзекі» з яе хворага мужа.

Я кажу Антону Яўгенавічу, што звычайна для наведвання хворых існуюць пэўныя гадзіны, і потым, здаецца, без халата ў бальніцу не дазволена ўваходзіць...

Галоўны ўрач пазірае на мяне, як на немаўля. Потым, прыжмурыўшы ва ўсмешцы вочы, разводзіць рукамі:

— Начальства ж. Што я ёй заўвагу зраблю?

— А ён вельмі хворы быў, Сярмяжка?

— Сумняваюся. Ва ўсякім разе шпацыраваў увесь час па калідоры.

— Чаму ж вы не пацікавіліся?

Галоўны ўрач паціскае плячыма:

— Ён мог нешта нядобрае падумаць... У яго быў урач Туроўскі, які яго лячыў. Але не падумайце, што я чалавек не прынцыповы. Калі той жа Сярмяжка прыйшоў да мяне па даведку аб пабоях, якія яму быццам бы былі нанесены міліцыяй, дык я адмовіў, бо ніякіх слядоў не было...

Але як такі дакумент потым усё ж такі фігураваў на судзе, ды за яго, галоўнага ўрача, подпісам, Антон Яўгенавіч растлумачыць не змог.

Што і казаць, лёгка быць прынцыповым чалавекам, калі гэтая прынцыповасць лёгка даецца, калі не трэба пры гэтым рызыкаваць уласным спакоем. А між тым людзі, з якімі я гутарыў з вока на вока, абураліся Сярмяжкам, абураліся мяккім прысудам яму, але... але трымалі дулю ў кішэні, няхай, маўляў, гэтую справу варушаць іншыя, хто нічым не рызыкуе... Ох, і жывучая ж яшчэ ў таго-сяго боязь выказаць уголас тое, пра што думаеш, у чым пераконаны.

Аднак пойдзем далей. Першымі словамі Таісіі Ільінічны Сярэнка, калі яна даведалася, па якой справе я прыехаў, былі:

— А справа ўжо закрыта, пра ўсё гэта ведаюць у... (Сярэнка назвала даволі высокую інстанцыю, праўда, не юрыдычную).

Мы доўга гутарылі з намеснікам старшыні райвыканкома. Так, я ёй спачуваў, разумеў яе, разумеў як чалавека, у якога здарылася асабістае няшчасце. І разам з тым адчуваў, што існавала і іншае, недзе ў чалавека жыла ўпэўненасць у тым, што яго службовае становішча дазваляе спадзявацца на нешта такое, на што не можа спадзявацца звычайны чалавек.

Таісія Ільінічна прызналася, што неўзабаве пасля таго, як на яе мужа была заведзена крымінальная справа, яна паехала ў Мінск да двух адказных абласных кіраўнікоў.

— І што вы ім сказалі?

— Я папрасіла, каб Сярмяжку не садзілі ў турму, бо ён такі чалавек, якога пазбаўленне волі не выхавае, а, наадварот, разбэсціць.

Няма чаго і казаць, логіка жалезная. Такі аргумент змог бы, відаць, прывесці кожны злачынца, якога збіраюцца пазбавіць волі. І потым таварышы, у якіх была Сярэнка, — не юрыдычныя работнікі. Як можна звяртацца да іх з пытаннямі, што з'яўляюцца кампетэнцыяй толькі судовых органаў?

Я сказаў пра гэта Таісіі Ільінічне. Яна трохі сумелася.

— Чаму ж?.. Яны займаюць высокія пасады... Могуць жа падказаць, каму трэба, параіць...

Не ведаю, што абяцалі Сярэнка высокія таварышы, але, відаць, яны падбадзёрылі яе, бо калі Сярмяжка атрымаў павестку ў суд, дык Таісія Ільінічна пазваніла па тэлефоне Г. І. Аляксеевай — старшаму суддзі і катэгарычным тонам заявіла, што муж яе ў суд не з'явіцца, бо ад'язджае на курорт. І толькі калі Сярэнка напомнілі, што з Сярмяжкі ўзята падпіска аб нявыездзе, мужу і жонцы прыйшлося скарыцца. Суд адбыўся ў прызначаны час (праўда, праз пяць месяцаў пасля дэбошу ў рэстаране), і на курорт абвінавачаны паехаў пасля вынясення прыгавору.

Які быў прыгавор, я расказаў. Расказаў і пра ўсе падзеі, якія папярэднічалі суду. Цяпер давайце разбяромся, чым кіраваўся суд, выносячы такі надзвычай мяккі прыгавор. Мы доўга размаўлялі на гэтую тэму з суддзёй Аляксандрам Мікалаевічам Крыскевічам, які вёў судовае пасяджэнне. Не ведаю, ці пераканаў яго я, але довады суддзі, лічу, не маюць пад сабой трывалай асновы.

Ён не ўтойваў, што на рашэнне суда аказала свой уплыў думка капыльскіх раённых кіруючых таварышаў, якія, маўляў, лепш ведаюць Сярмяжку.

Ну і ну. А навошта тады наогул суд! Значыць, калі б не было гэтага заступніцтва, тады б і прыгавор гучаў інакш? Пры адным і тым жа саставе злачынства...

Я, вядома, далёкі ад думкі, што суд павінен абстрагавацца ад асобы абвінавачанага, не ўлічваць, не прымаць пад увагу ўсё яго ранейшае жыццё. Бываюць трагічныя памылкі, бывае розны збег акалічнасцей і г. д. Жыццё ёсць жыццё.

Але ж у дадзеным выпадку няма літаральна ніводнага доказу таго, што п'яны дэбош Сярмяжкі — трагічная выпадковасць. Маўляў, д'ябал збіў з панталыку.

Не трэба быць вельмі пільным чалавекам, дастаткова толькі ўважліва пазнаёміцца з дакументамі крымінальнай справы Сярмяжкі, каб упэўніцца: тое, што з ім здарылася, лагічна для яго.

Але суддзя не захацеў гэтага ўбачыць...

І выцягваецца артыкул 43 КК БССР, які прадугледжвае прымяненне ўмоўнага пакарання, калі суд знойдзе, што некаторыя акалічнасці дазваляюць не прыбягаць да пазбаўлення волі.

У дадзеным выпадку суд быў расчулены тым, што, па-першае, Сярмяжка прызнаў сваю віну, падругое, у яго добрыя характарыстыкі з месца работы, па-трэцяе — ён сямейны... А яшчэ: не меў раней судзімасці. Ды і пацярпеўшыя не патрабавалі пазбаўлення волі.

Самае цікавае, што амаль кожны з аргументаў абвяргаецца дакументамі крымінальнай справы, ходам судовага разгляду.

Першае. «Прызнаў сябе вінаватым». Чытаю самы першы пратакол допыту Сярмяжкі: «Зайшоў вечарам у рэстаран, выпіў бутэльку піва і накіраваўся дадому. На вуліцы мяне раптам абкружылі тры работнікі міліцыі і пачалі збіваць. Патрабую суровага іх пакарання». І толькі паступова, ад допыту да допыту, пад цяжарам паказанняў шматлікіх сведак Сярмяжка скрозь зубы вымушан прызнацца, што піў ён гарэлку, што лез у бойку з поварам, што абражаў работнікаў рэстарана і, нарэшце, што ўдарыў нагой у жывот супрацоўніка міліцыі Ждановіча. Гэта называецца прызнаннем?

Другое. Добрыя характарыстыкі. Іх у справе — дзве. Адна — падпісаная старшынёй абкома прафсаюза рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак П. Зарыным. У ёй гаворыцца, што Сярмяжка спраўляўся з работай, рэгулярна праводзіў пленумы і пасяджэнні прэзідыума. План збору членскіх узносаў за 1965 год выкананы на 96,3 працэнта.

Другую характарыстыку Сярмяжку даў сакратар партарганізацыі Капыльскага РК КПБ С. Меляшкевіч для афармлення дакументаў на турысцкую паездку ў Балгарыю. (Гэта было летась). Там пішацца:

«...Маральна ўстойлівы, акуратны і ветлівы» (падкрэслена намі).

Наколькі адпавядае гэтая характарыстыка сапраўднасці, чытач можа меркаваць сам.

Трэцяе. Не меў раней судзімасці. Гэта так. Але са шматлікіх паказанняў сведак і іншых дакументаў, падшытых у справе, паўстае чалавек, для якога многія маральныя нормы нашага агульнага жыцця — паняцці абстрактныя.

Вось даведка дзяржаўнай аўтаінспекцыі. Яшчэ год назад Сярмяжка быў пазбаўлены правоў вадзіцеля за язду ў нецвярозым стане. (Дарэчы, суддзя прызнаўся, што гэтая даведка неяк прайшла міма яго ўвагі, ён яе не прыкмеціў у справе). А вось паказанні, якія расказваюць пра іншыя «подзвігі» падсуднага. Ён быў блізкім сябрам, хаўрусніка нейкага Пінчука, былога старшыні капыльскага спартыўнага таварыства «Ураджай», асуджанага судом на 10 год пазбаўлення волі за грашовыя махінацыі. Яны разам пілі, на машыне Сярмяжкі разам выязджалі на папойкі ў лес.

Чацвёртае. Пацярпеўшыя не патрабавалі, каб суд пазбаўляў Сярмяжку волі. Але ж і гэта няпраўда. Галоўны пацярпеўшы А. Ждановіч — аперупаўнаважаны міліцыі, які, дарэчы, увесь час не даваў «патухнуць» гэтай справе (а такое ледзь не здарылася), патрабаваў на судзе (як, дарэчы, і пракурор) строгага пакарання Сярмяжкі.

Вось такія «аргументы» ў карысць прымянення артыкула 43 аб магчымасці ўмоўнага асуджэння. Ці не шыта ўсё гэта белымі ніткамі?

Багіню правасуддзя Феміду малююць з завязанымі вачыма. У руках яе вагі, на якія пакладзены добрыя і нядобрыя ўчынкі. Што перацягне. Але вочы Феміды, паўтараю, завязаны. Каб не бачыць, хто перад ёй, каб судзіць аб'ектыўна — перад законам усе павінны быць роўнымі.

На гэты раз у нашай Феміды вочы былі развязаны. І таму, відаць, усё так здарылася.

Яшчэ з далёкіх студэнцкіх гадоў я запомніў лацінскую прыказку, якая на нашай мове гучыць прыкладна так: «Што можа дазволіць сабе Юпітэр, тое не дазволена быку». Відаць, ёсць яшчэ ў нас людзі, якія схільны прымяніць у жыцці гэтую старажытную прыказку. Не, для нашага грамадства яна не падыходзіць. У нас усе роўныя перад законам. І просты працаўнік, і чалавек, якому дзяржава даверыла нейкую пасаду. І памыляюцца тыя, хто мяркуе, быццам гэтая пасада дае ім толькі правы, вызваляючы ад абавязкаў. Не, калі ты займаеш пасаду, дык з цябе трайное патрабаванне. Бо ты адказваеш не толькі за сябе, у тваёй асобе народ бачыць перш за ўсё прадстаўніка ўлады, і гэта да многага абавязвае.

У канцы яшчэ пра адно. Сярмяжку судзіў не Капыльскі, а Слуцкі народны суд. Чаму? У абласным судзе палічылі, што так будзе лепей, бо ў Капыль на суд могуць аказаць уплыў... Дзіўна чуць гэта. Дзіўна ўжо таму, што ў наш час дапускаецца магчымасць уплыву на суд. Само гэта пра многае сведчыць...

Але няхай. Толькі маглі ж зрабіць так, каб слуцкая Феміда прыехала ў Капыль (гэта ж побач) і здзяйсняла суд, як кажуць, на месцы злачынства. Бо судовы разгляд — гэта ж яшчэ і выхаваўчая мера. Для многіх. Тым больш, што грамадскасць раёна вельмі цікавілася справай Сярмяжкі.

Зрабілі ж усё інакш. Дрэнна зрабілі. Слуцкая Феміда аказалася не на вышыні.

М. ЗАМСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

Капыль — Слуцк — Мінск.

ПАМЯЦІ ПАЭТА

Два гады існуе ў Львове беларускае земляцтва. За гэты час студэнты з Беларусі, якія навучаюцца ў шасці вну Львова, неаднаразова збіраліся на сяброўскія сустрэчы, літаратурныя вечары.

Цяпер яны рыхтуюцца адзначыць юбілей класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. У гэтых урачыстасцях самы шырокі ўдзел прымуць і украінскія сябры.

Моцныя сувязі яднаюць М. Багдановіча, даследчыка славяншчыны, з украінскай зямлёй. Паэзія перакладчыка і твораў Т. Шаўчэнкі, І. Франка і іншых украінскіх паэтаў і празаікаў адразу знайшла шырокі водгук ва ўкраінскіх літаратурных колах. Можа толькі з Купалам можна параўнаць папулярнасць Багдановіча сярод украінскіх чытачоў.

Урачыстасці, прысвечаныя 75-годдзю з дня нараджэння вялікага беларускага паэта, пачаліся ўжо. Нядаўна ў Львове адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны яго памяці. Студэнткі-беларускі Марыя Ягоўдзік, Галіна Антановіч, Валянціна Коўтун чыталі на вечары вершы Максіма Багдановіча. Студэнт паліграфічнага інстытута беларус Рыгор Фралоў напісаў цудоўны партрэт паэта.

г. Львоў.

С. ПАНІЗНІК.

З ВЫСТАЎКІ МАЛАДЫХ МАСТАКОЎ



Б. ЗАБОРАЎ. «Сазопальскія рыбакі» (масла).

Георгій СВІРЫДАЎ,
народны артыст РСФСР

ВЫСОКІЯ ІДЭАЛЫ СУЧАСНАСЦІ

Вядомы савецкі кампазітар, лаўрэат Ленінскай прэміі Георгій Свірыдаў — аўтар рада буйных вакальна-сімфанічных твораў на тэксты рускіх паэтаў.

Па просьбе карэспандэнта АДН ён дзеліцца сваімі думкамі аб музыцы сённяшняга дня.

Кожны год у нашай краіне кампазітары выносяць на суд слухача дзесяткі твораў самых разнастайных жанраў. Мы пазнаём новыя імёны таленавітых мастакоў — непадобных па стылю, маштабу таленту, тэмпераменту, але аб'яднаных ідэяй служэння людзям, імкненнем сказаць сваё слова ў мастацтве.

Сустрэча з таленавітым творам заўсёды радасная. Такой радасцю для мяне было нядаўняе знаёмства з работай зусім маладога чалавека, аспіранта Ленінградскай кансерваторыі Валерыя Гаўрыліна. Яго «Рускі сшытак» — цыкл песень на народныя словы — у вышэйшай ступені самабытны. Пазбаўленая ўсялякага элементу стылізацыі, народная па духу музыка пабудавана на самастойных, арыгінальных інтанацыях. Вытанчанасць яго музычнай палітры — сведчанне глыбока засвоенай нацыянальнай і еўрапейскай культуры.

Я атрымаў не проста велізарную эстэтычную асалоду, слухаючы «Рускі сшытак». Гэты твор выклікае роздум аб пераемнасці традыцый, аб непарыўнай сувязі нашага мастацтва са старажытнай нацыянальнай музычнай спадчынай.

Творчае асэнсаванне традыцыі ў спалучэнні з вострым пачуццём сучаснасці, чым так цікава работа Гаўрыліна, на жаль, не заўсёды сустракаецца ў новых творах сур'ёзнай музыкі. Даводзіцца часам чуць залішне традыцыйныя, эпігонскія спалучэнні. Іх аўтары не абцяжараваюць сябе пошукамі новага, свайго, а механічна выкарыстоўваюць формы і прыёмы, знойдзеныя вялікімі майстрамі. Вонкава быццам бы добра, а па сутнасці слаба.

Не менш страшны біч — эксперыментатарства, якое не абапіраецца на сур'ёзны змест, не выклікана ўнутранай неабходнасцю. Не ўтаю, і ў нашым кампазітарскім асяроддзі ёсць пакуль прыклады пераймання крыклівага мадэрнізму, калі аддаецца перабольшаная ўвага ўласна гуку, калі гарманічныя і аркестравыя эфекты ператвараюцца ў самамэту.

І эпігонства, і крыклівы мадэрнізм — з'явы, па сутнасці, аднаго парадку. Яны прыводзяць да зніжэння ўзроўню мастацтва, вытручваюць з яго маральную ідэю — аснову ўсяго вялікага.

А нішто так не ідзе ўразрэз з традыцыямі рускага мастацтва, як зніжэнне творчай задачы, адсутнасць у творы глыбокай думкі. Наша руская музыка заўсёды вызначалася якраз тым, што ў аснову яе закладваўся змест вялікай, надзённай важнасці.

Лепшыя творы савецкага мастацтва развіваюць менавіта гэтую традыцыю. Яны сучасныя не толькі тэхнічнымі навінамі, хоць гэта таксама важна і каштоўна, а дзякуючы дару іх творцаў «чуць» час, праўдзіва адгукацца на значныя падзеі сваёй эпохі.

Вялікія мастакі заўсёды ўмеюць узяць з жыцця новы змест і знайсці сродкі для выяўлення яго ў арыгінальнай свежай форме. Ды і сапраўды новы матэрыял ніколі не ўкладзецца ў старую форму. Ён будзе актыўна супраціўляцца гэтаму прымусоваму акту і, урэшце, разбурыць яе.

Такое наватарства. Яно выклікана да жыцця новым вобразна-эмацыянальным ладам, новым поглядам на свет, на навакольную рэчаіснасць. Найбольш удалыя, цікавыя пошукі формы амаль заўсёды звязаны са свежымі музычнымі інтанацыямі. Але якраз характэрны недахоп многіх маладых кампазітараў — слабы пошук у інтанацыйным плане, які перашкаджае ім дамагацца большай сілы выяўлення.

Дзе ж крыніцы новых, сучасных музычных інтанацый? Услухайцеся ў чалавечую мову. Манера мовы, яе рытміка, мелодыя — вытворныя часу. Тэмп, рытм мовы сучаснага чалавека не той, што быў нават дваццаць год назад. Мяняецца і меладычны распеў, і гутарковыя інтанацыі. На мой погляд, у гэтай скарбніцы — чалавечай мове — тояцца ўсе багацці музыкі — і ўжо напісанай, і будучай. Трэба ўмець толькі ўслухоўвацца ў мову — аснову сучаснай музычнай мовы.

Мне хацелася б спыніцца яшчэ на адным яркім творы апошняга часу — араторыі грузінскага кампазітара Атара Такта кішвілі «Па слядах Руставелі» на тэкст паэта Іраклія Абашыдзе.

У аснове араторыі ляжыць легенда пра апошнія дні жыцця вялікага сына Грузіі. Легенда старажытная. Але Такта кішвілі, сапраўдны мастак, раскрывае ў ёй сваю тэму, выяўляе тое, што адпавядае духоўным запатрабаванням нашых дзён.

Музыка араторыі, якая бярэ вытокі ў старажытнай культавай грузінскай музыцы, сучасная па сваім ладзе і інтанацыях, праўдзіва выказвае глыбока чалавечыя пачуцці і думкі.

За апошнія гады асабліва прыкметная цяга кампазітараў да вакальна-сімфанічнага жанру, калі музыка звязваецца са словам, з сучаснай паэзіяй. Гэта невыпадкова. Араторыя, па-мойму, жанр, вынесены на паверхню часам. Саюз сімфанічна маштабнай музыкі з палымяным паэтычным словам як нельга лепш памагае выказаць вялікія ідэі, якія адпавядаюць духу нашага жыцця.

У маёй творчасці гэты жанр займае асаблівае месца. Цяпер я падводжу рысу пад шматгадовай працай: заканчваю буйную кампазіцыю на словы Аляксандра Блока, задуманую як заключная частка вялікай аратарыяльнай трылогіі. Дзве першыя яе часткі — «Паэма памяці Сяргея Ясеніна» і «Патэтычная араторыя» на словы Маякоўскага.

Мастацтва — равеснік чалавецтва. Мяняліся эпохі, грамадскія фармацыі, погляды, але ва ўсе часы заставалася непахісным яго асноўнае прызначэнне: несці людзям праўду, памагаць жыць лепш, быць дабрэйшымі, чысцейшымі. Вечная, цудоўная місія. Музыка ж — універсальная мова мастацтва. Яна звернута да ўсіх, даступная кожнаму. І няма для кампазітара задачы больш адказнай і гуманнай, чым сродкамі гэтай мовы несці людзям высокія ідэалы сучаснасці.

СОТЫ СПЕКТАКЛЬ

У Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача адбыўся 100-ы спектакль «За лясамі дрымучымі», пастаўлены заслужаным дзеячом мастацтваў БССР Л. Мазалеўскай па п'есе А. Вольскага і П. Макаля. Галоўныя ролі ў спектаклі выконвалі заслужаныя артысты БССР Ул. Говар-Бандарэнка і П. Дубашынскі, артысты Л. Цімафеева, Л. Міхайлаў, П. Ротэр, Э. Шаміёнка.

У спектаклі заняты ўвесь творчы састаў тэатра.

Сярод кніг

СТАРАЖЫТНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ГАРАДЫ

Пра развіццё прадукцыйных сіл, пра стан эканомікі ў феадальным грамадстве ў значнай ступені прынята меркаваць па развіцці гарадоў, гарадскога рамяства і гандлю. Таму ў тых выпадках, калі гісторыя гарадоў не распрацавана і звесткі аб гарадах мізэрныя, лічаць, што і ўзровень развіцця прадукцыйных сіл у такім грамадстве знаходзіўся на нізкім узроўні. Падобнае меркаванне выказвалася буржуазнымі гісторыкамі і ў адносінах да Беларусі XVI — XVII стагоддзяў, бо гісторыя беларускіх гарадоў да апошняга часу была вельмі мала вядомая. Пераважала думка, што ў перыяд феадалізму беларускія гарады не развіваліся і былі ў стане заняпаду.

Савецкія беларускія гісторыкі, якія праводзілі даследаванні па гісторыі гарадоў перыяду феадалізму, — Ул. Пічэта, В. Дружчыц, Д. Даўгяла, А. Бурдзейка, Т. Забела, Л. Абецадарскі, З. Капыскі, А. Карпачоў, С. Шчарбакоў, А. Ігнаценка і іншыя ў значнай ступені адвергілі памылковыя погляды буржуазных гісторыкаў. Аднак работы савецкіх даследчыкаў адносіліся да вывучэння гісторыі асобных гарадоў або да вузкіх, спецыфічных тэм. Таму выхад у свет кнігі З. Капыскага «Эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі (XVI—XVII ст. ст.)», у якой асвятляюцца ўсе асноўныя праблемы развіцця гарадоў Беларусі ў цэлым, з'яўляецца нібы вынікам шматгадовых прац савецкіх гісторыкаў па гэтай праблеме. Названая кніга наносіць канчатковы ўдар па многіх штучных і прадузятых схемах, што бытавалі ў гістарычнай навуцы ў адносінах да беларускіх гарадоў.

Першы раздзел кнігі прысвечаны агульнай характарыстыцы гарадоў і іх насельніцтва. Аўтар даволі пераканаўча даказвае, што ў XVI—XVII стагоддзях на тэрыторыі Беларусі было ўжо не менш як 350 гарадоў і паселішчаў гарадскога тыпу, сярод якіх многія налічвалі больш за 10 тысяч жыхароў (Брэст, Пінск, Мінск, Слуцк, Магілёў, Навагрудак, Полацк, Віцебск). У беларускіх гарадах, паводле звестак аўтара, у той час пражывала не менш як 370 тысяч чалавек, што складала каля 16 працэнтаў усяго насельніцтва. У кнізе паказана класавае расслаенне гарадскога насельніцтва, сярод якога былі людзі, якія валодалі велізарнымі багаццямі, як, напрыклад, полацкі купец Якаў Фёдаравіч Хадыка або магілёўскі купец Цімафей Гапонавіч Козел.

Да зусім новых вываду прыходзіць аўтар пры даследаванні пытання аб нацыянальным складзе насельніцтва беларускіх гарадоў. На аснове аналізу дакументальных звестак аўтар паказвае, што пераважная большасць гараджан складалася з беларусаў і асноўным асяроддзем, з якога фарміравалася гарадское насельніцтва, было беларускае сялянства. Тым самым абвяргаецца раней пашыраная думка, быццам сярэдневяковыя гарады Беларусі не былі па сутнасці беларускімі. Асвятляючы эканамічныя сувязі горада з сельскай гаспадаркай, аўтар прыходзіць да вываду аб тым, што гарады сваім існаваннем і развіццём стрымлівалі рост адпрацовачнай рэнты і садзейнічалі некаторааму абмежаванню самых дзікіх форм прыгонніцтва.

Разглядаючы пытанне аб развіцці рамеснай вытворчасці, аўтар паказвае, што рамяство знаходзілася на параўнальна высокім узроўні, а рамеснікі вызначаліся высокім майстэрствам. У вялікіх гарадах Беларусі, толькі паводле пісьмовых крыніц, налічвалася па 50—80 рамесных прафесій. Па ўсёй Беларусі было каля 200 прафесій. Рамеснікі складалі не менш палавіны ўсіх гарадскіх жыхароў. Гэтыя звесткі даюць аўтару магчымасць зрабіць вывад аб тым, што гарады Беларусі развіваліся такімі ж шляхамі, як і ў іншых еўрапейскіх краінах.

Значную цікавасць мае раздзел пра цэхавыя арганізацыі рамеснікаў, у якім падрабязна асвятляецца пытанне аб юрыдычных актах, якія рэгулявалі ўнутраны лад і прававое становішча ў горадзе цэхавых арганізацый, а таксама значэнне і ролю цэхаў у развіцці гарадоў.

Новым у нашай гістарычнай літаратуры з'яўляецца зроблены аўтарам аналіз крэдытна-пазыковых аперацый беларускага купецтва і іншых слаёў насельніцтва. У кнізе ўпершыню асаблівая ўвага аддадзена ўнутрыдзяржаўнаму гандлю і таварнаму абмену паміж горадам і вёскай. Каштоўныя звесткі ёсць і ў раздзеле аб знешнім гандлі. Так, на аснове аналізу пісьмовых крыніц аўтар прыходзіць да вываду, што гандлёвыя сувязі беларускіх гарадоў толькі з польскімі гарадамі падтрымлівалі не менш чым 600 беларускіх купцоў. Гаворачы пра нацыянальны склад беларускага купецтва, аўтар цалкам абвяргае сцвярджэнні буржуазных гісторыкаў, якія лічылі, што ўвесь знешні гандаль быў у руках палякаў, яўрэяў і немцаў. На падставе старанпага аналізу гістарычных дадзеных аўтар паказвае, што прыкладна 80—82 працэнты ўсяго купецтва складалі беларусы. Напрыклад, на долю беларускіх купцоў прыпадала 89 працэнтаў усіх зробленых у 1605 годзе замежных паездак.

Падводзячы вынік сваім даследаванням, аўтар прыходзіць да вываду, што гарадское насельніцтва Беларусі садзейнічала ліквідацыі ізаляванасці і замкнёнасці асобных раёнаў краіны і тым самым садзейнічала эканамічнаму, палітычнаму і культурнаму збліжэнню асобных зямель і адыграла важную ролю ў фарміраванні і развіцці беларускай народнасці і яе культуры.

Рэцэнзуемая работа ў значнай ступені ліквідуе недахопы ў даследаванні гісторыі нашых гарадоў і паслужыць асновай для перагляду многіх застарэлых і памылковых палажэнняў не толькі ў гістарычнай навуцы, але і ў некаторых сумежных навуках, такіх, як гісторыя эканомікі і гісторыя дзяржавы і права.

Адзначаючы станоўчыя якасці кнігі, нельга абысці маўчаннем і некаторыя спрэчныя сцвярджэнні. Так, на стар. 5 аўтар гаворыць, што гарады Беларусі ўзніклі паміж IX і XII стагоддзямі. Гэта сцвярджэнне аўтара не заснавана на якіх-небудзь доказах, бо на падставе археалагічных раскопак і з іншых крыніц вядома, што гарадскія паселенні на тэрыторыі Беларусі існавалі значна раней IX стагоддзя і працягвалі ўзнікаць пазней XII стагоддзя. Пярэчанне выклікае зроблены аўтарам разлік колькасці насельніцтва ў буйнейшых гарадах Беларусі. З. Капыскі зыходзіць з таго, што ў адным гарадскім домаўладанні жылі толькі пяць чалавек. Лічба гэта яўна заніжана. Адно гарадское домаўладанне часта складалася з некалькіх дамоў або шматкватэрнага дома, дзе жыло некалькі сем'яў. Трэба ўлічыць, што разам з купцамі і рамеснікамі жылі слугі, аканомы, падмайстры, вучні і г. д. Відаць, сярэдні склад сям'і, калі разам з бацькамі жылі іх жанатыя сыны і замужнія дочкі, было б больш правільна вызначаць у 8—12 чалавек. Таму ў сярэднім на адно гарадское домаўладанне прыпадала не менш 10—15 чалавек.

На стар. 89 аўтар у адным месцы ўказвае, што ў Мінску было 32 прафесіі, а потым, праз два радкі ніжэй, гаворыць, што іх было адзінаццаць.

Спрэчныя моманты, аднак, не зніжаюць агульнага высокага навуковага ўзроўню работы. Кніга З. Капыскага напісана на аснове марксісцка-ленінскага вучэння аб законах грамадскага развіцця і базіруецца на канкрэтна-гістарычным аналізе фактаў, многія з якіх даследаваны ўпершыню. Вывады, да якіх прыходзіць аўтар, лагічна пераканаўчыя і гранічна ясныя. Таму кніга даступная не толькі навуковым работнікам і студэнтам, але можа быць выкарыстана шырокім колам чытачоў, якія цікавяцца гісторыяй Беларусі.

І. ЮХО,
дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна.

З. Ю. Капыскі. «Эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі (XVI — XVII ст. ст.)». На рускай мове. Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск. 1966.

У НАС У ГАСЦЯХ—ПАЭЗІЯ «САВЕТЫШ ГЕЙМЛАНД»

Спаўнілася, пяць год літаратурна - мастацкаму часопісу на яўрэйскай мове «Саветыш Геймланд» («Савецкая Радзіма»). Часопіс выходзіць у Маскве, але на яго старонках актыўна і сістэматычна друкуюцца паэты, празаікі, крытыкі, якія жывуць і працуюць ва ўсіх кутках нашай краіны і якія разам складаюць адзін з атрадаў шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

За пяць год свайго існавання часопіс змясціў нямала твораў, якія палюбіліся чытачу, — у іх і глыбіня пранікнення ў народнае жыццё, і пафас ленінскага інтэрнацыяналізму, і вернасць лепшым рэалістычным традыцыям яўрэйскай мастацкай класікі і яўрэйскай літаратуры савецкага часу.

Часопіс «Саветыш Геймланд» вядзе вялікую работу з чытачамі і часцей за ўсё — у форме літаратурных вечароў у буйнейшых гарадах Савецкага Саюза. Такія вечары — і зайсёды з нязменным поспехам — прайшлі ў Вільнюсе, Кіеве, Кішыневе.

Заўтра, 26 кастрычніка, вечар яўрэйскай савецкай літаратуры, арганізаваны рэдакцыяй часопіса «Саветыш Геймланд», адбудзецца і ў нас, у Мінску.

У госці да чытачоў-мінчан прыехала група пісьменнікаў на чале з галоўным рэдактарам часопіса паэтам А. Вергелісам. У складзе групы — паэты А. Гантар, М. Грубіян, М. Ліфшыц, М. Тэйф, Я. Штэрнберг, празаік М. Лей і крытык Р. Рубіна.

Разам з гасцямі на вечары выступяць яўрэйскія паэты Мінска Х. Мальцінскі і Р. Рэлес, а таксама беларускія паэты — перакладчыкі яўрэйскай савецкай паэзіі.

А. ТЭЙФ

ДОБРЫ СУСЕД

Парканы ды брамкі. Стаіць ля аптэкі
Наш домік у засені рослых акацый.
Відаць, захаваюцца ў сэрцы навекі
Мінск, Пралетарская, дом 18.

І мне 18! О, мілы анёлак,
Што з Капыля, дзе на лузе і ў полі
Раса зіхаціць, быццам фарбы вясёлак,
Дзе важна з таполяй гамоніць таполя.

Не знаю—касою, губамі, вачамі
Мяне гэта дзеўчына прываражыла...
Лятаў на спатканне глухімі начамі,
А крылы давала мне нейкая сіла.

— Ты бэзу нарві,—усміхнецца,
бывала,—
За кожную гроначку я пацалую.
Ламаю, ламаю, а ўсё неяк мала,
Духмянага бэзу мне мала, шкадую.

Лічу я, лічу я за кветкаю кветку,
Чакае анёлак за нізкім парканам.
Спусцілася ноч на зямлю неўзаметку,
Употай спаткацца яна памагла нам.

А жыў у тым садзе паэт знакаміты.
Мы бралі ваду з ім з агульнай
крыніцы.
І нізкім парканам, плюшчом апавітым,
Завулак дзяліўся, нібыта граніцай.

Не садам, суседам сваім любаваўся,
Калі абыходзіў ён ранкам дарожкі.
Куст бэзу над сцежкай пачціва
схіляўся,
Цюльпаны згіналі зялёныя ножкі.

Прыходзілі потым к паэту вяскоўцы,
У зрэбных кашулях, народ небагаты.
Я слухаў: спяваюць пад яблыняй
хлопцы.
І песні ляцяць, быццам птушкі,
дахаты.

І ведаюць маткі ў далёкім Палессі,
Што добра сынам у Купалы гасціцца.
Юнацтва маё! Беларускія песні!
Хачу—хай спачатку усё паўтарыцца!

...А раніцай зноў я з'явіўся за бэзам.
Нарваў і хутчэй да паркану імчуся.
Павіс. Але нешта ніяк не залезу.
Спаймалі! Ад страху я ўвесь
калачуся.

Я выскачыць проста гатоў з апранахі.
Сусед засмяяўся, схіляецца бліжай:
— Паслухай: пяюць пералётныя
птахі,
Вярнуцца паспелі дадому яны ўжо.
Не думай, што кветак шкадую.
Мой мілы,
Шкада, што цішком ты за бэзам
прыходзіш,
Я чуў, што і ты пераводзіш чарніла,
Над першымі вершамі ночы
праводзіш...

...Гады прамінулі. Вайна адгрымела.
Вярнуўся дамоў я к маўклівым
руінам.
Ля рова, дзе чуецца рэха расстрэлаў,
Адзін я смуткую над жонкай і сынам.

Ды саду і дому таму ля аптэкі
З-пад попелу суджана ўсё-такі
ўзняцца,
Бо ў сэрцы маім засталіся навекі
Мінск, Пралетарская, дом 18.

Пераклаў А. ЗАРЫЦКІ.

М. ГРУБІЯН

БЕЛАРУСІ

Я з усіх тваіх рэк
піў прыгоршчамі,
Сум дзяліў твой,
з прыгоркамі спіну
прыгорбіўшы.
Я гарэлку настойваў
на ўсіх тваіх ягадах,
Твае скрыпкі настройваў
на вяселлях для злагады.
Я кашулі ткаў
з тваіх сініх ільноў,
Я імёны шукаў
для тваіх сыноў.
Ішоў, забыўшы страх,
з перапраў у бой,
І на ўсіх кастрах
дагараў з табой!
З гарадамі тваімі, вёскамі,
З маладымі
тваімі вёснамі.

Ад світальных гудкоў
да рыпу саннага—
Я насіў цябе
ля сэрца самага!

Пераклаў Р. БАРАДУЛІН.

Х. МАЛЬЦІНСКІ

■ ■ ■

Да старасці ўжо так нямнога.
А мне яшчэ нажыцца трэба
удосталь летам і зімой.
Бо дужа ж смачны аржанога
хлеба
акрайчык мой.

■ ■ ■

Дзень будзе зноў няпёгкім.
Стомы цень.
Кругамі вочы паабвёў мае.
Перад світаннем я пачуць хацеў,
Якая птушка першай запяе.

Каты ў дварах зрывалі галасы.
Не заціхаў шалёны брэх сабак.
І ціхай песні, кволай ад расы,
Я да відна не мог пачуць ніяк.

Пераклаў Г. БУРАЎКІН.

А. ВЕРГЕЛІС

■ ■ ■

Быць аднаму,
без сяброў,—
самая страшная кара.
Прага сяброўства
жыве ў нас,
як крылы Ікара.

Вось на вайне:
слота і снайпер не спіць...
Але я, непаседа,
Поўзаў у дождж праліўны
прыкурыць да суседа.
—Куля дагоніць!..
— Куды ты!..
—І хай з ёю чэрці!..
Па чалавеку туга
мацней ад металу і смерці.

Помніцца мне—
паляўнічы
маўчальнікам быў адмысловым,
Але прыходзіў ка мне
перакінуцца словам.
Сто кіламетраў—
не жарты!—
праз бор некрануты,
Толькі б спаткацца,
пабыць з чалавекам мінуту.
Прага сяброўства
расце ў нас,
як крылы Ікара.
Быць аднаму.
без сяброў—
самая страшная кара.

Пераклаў П. МАКАЛЬ.

М. ЛІФШЫЦ

■ ■ ■

Патухне зыркі
У кузні жар,
Калі гарно не дыша.
Каму патрэбен
той пясняр,
Які даўно не піша!
Настаўнік,
Нават неблагі,
Без вучня
ўсё забудзе.
І толькі вязень
Сез турмы
Свабодны
зноўку
будзе.

Пераклаў М. ХВЕДАРОВІЧ.

А. ГАНТАР

■ ■ ■

Пчалу на працы бачыў ты ці не!
Калі нектар збірае з кветак саду,
Дык не чапай яе, бо моцна джыгане,
І ты аж скурчышся ад кроплі яду.

Нектар мой — верш,
Яму я родны брат.
Там сонца бляск
І ёсць пчаліны яд.

Пераклаў М. ХВЕДАРОВІЧ.

Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь»: «Крэсы змагаюцца» М. Машары, «Дыханне» Г. Бураўкіна, «Вогненны азімут» А. Асіпенкі.

Па слядах Купалы

У адной з залаў Літаратурнага музея Янкі Купалы вісіць карта паездак народнага паэта па краіне. Чырвоныя стрэлачкі бягуць у Маскву, Ленінград, Харкаў, Казань, Кіеў... У гэтых і іншых гарадах яшчэ жывуць сябры і знаёмыя Купалы. Яны даслалі музею свае ўспаміны аб песняру, рэдкія фотаздымкі, кнігі.

Здаецца, сабрана ўсё, што датычыцца біяграфіі нашага народнага паэта, яго творчай і грамадскай дзейнасці. Але гэта толькі здаецца...

Стрэлачкі на вышэй нагаданай карце бягуць таксама ў Тбілісі, Ерэван, Сухумі. Янка Купала даволі часта наведваў Каўказ. У 1937 годзе ён прымае ўдзел у рабоце V пленума праўлення Саюза пісьменнікаў СССР у Тбілісі, які быў прысвечаны 750-годдзю з дня напісання паэмы «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш. Руставелі. У 1939 годзе ён выязджае ў Ерэван для ўдзелу ў юбілейным пленуме, прысвечаным 1000-годдзю эпаса «Давід Сасунскі». У лютым 1941 года ён зноў у Тбілісі.

Паездкі паэта на Каўказ былі вельмі плённыя. Умацоўвалася дружба братніх нацыянальных літаратур, стараліся навеяныя гэтай дружбай вершы. Пра паездкі ў Грузію і Арменію расказваюць і шматлікія дакументы, якія захоўваюцца ў музеі паэта. Разам з тым многа было яшчэ невядомага, нявысветленага, недакладнага. У матэрыялах музея, напрыклад, значылася, што ў снежні 1938 г. Купала, паводле парады ўрачоў, прыехаў у Сухумі ў дом адпачынку «Сіноп». Сябры з Абхазіі даслалі ў музей невялічкі здымак, змешчаны ў газеце «Апсны Капш» («Чырвоная Абхазія»), на якім сфатаграфаваны Я. Купала з маладым абхазскім паэтам К. Агумаа. Меркавалася, што ў той час паэты і сфатаграфаваліся. Вось усё, што было вядома пра гэту паездку. Разам з тым не верылася, што ў пісьменнікаў не было ніякіх размоў аб развіцці і лёсе фрэнты літаратур, што не было сустрэч з іншымі пісьменнікамі.

І вось сёлета мне давялося праехаць па тых месцах, дзе некалі быў Купала. Зайшоў у Саюз пісьменнікаў Абхазіі. Тут не захавалася ніякіх матэрыялаў пра знаходжанне нашага песняра. Адзінае, што параілі мне, — пагартаць падшыўку газет і сустрэцца з удавой Агумаа — Кацярынай Ліванаўнай Агумаа. У газеце «Советская Абхазия» за 1939 год знаходжу інфармацыю аб прыездзе Я. Купалы ў Сухумі. Аказваецца, прыехаў ён сюды не ў снежні 1938 года, а ў кастрычніку 1939 года. Тут жа змешчана і фота. Пра тое, як праходзіла гэтая сустрэча, жонка Агумаа нічога пэўнага сказаць не магла. Але яна заўважыла, што Кіязым Агумаа быў вельмі ўсхваляваны тады і многа расказваў пра знаёмства з беларускім песняром. Кацярына Ліванаўна параіла ўбачыцца з жонкай паэта Леварса Квіцынія, які ў той час быў старшынёй Саюза пісьменнікаў Абхазіі.

Іду па слядах Купалы...

І вось трымаю ў руках фотаздымак, які зусім невядомы ў Беларусі. На ім — К. Агумаа, Л. Квіцынія, Я. Купала. Сустрэча адбылася ў 1939 г. у Саюзе пісьменнікаў Абхазіі. На ёй ішла гаворка пра ўмацаванне сувязей паміж беларускай і абхазскай літаратурамі, пра пераклады твораў і карысць творчых сустрэч. Янка Купала паведаміў сваім сябрам, што ён намерваецца быць у Абхазіі цэлы месяц і ўвесь гэты час будзе працаваць над сцэнарыем для кінафільма з жыцця беларускага народа.

Гэта ўжо навіна. Пра Купалу-кінасцэнарыста мы нічога не ведаем. Цяпер жа аказваецца, што ў паэта былі намеры напісаць кінасцэнарый, бо вось жа ў маіх руках інтэрв'ю, дадзенае песняром карэспандэнту «Советской Абхазии», дзе ясна сказана, што Я. Купала прыехаў у Абхазію не толькі адпачываць, але і працаваць над кінасцэнарыем.

Удалося высветліць, што напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны Л. Квіцынія перакладаў вершы Я. Купалы на абхазскую мову. Але ў друк яны не трапілі. Магчыма, таму, што ў канцы 1939 года Л. Квіцынія прызвалі ў Чырвоную Армію і ён быў адарваны ад мясцовых газет і часопісаў.

Я даведаўся таксама, што Л. Квіцынія служыў на пагранічнай заставе непадалёк ад Беластока, дзе і загінуў — у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. На заставе ім быў напісаны адзін з апошніх вершаў «Ты клапатліва ходзіш...»

Амаль усю Вялікую Айчынную вайну ваяваў у беларускім партызанскім атрадзе імя Чапаева К. Агумаа. Быў цяжка паранены. У лясах Магілёўшчыны і Гомельшчыны паэт напісаў вершы, якія сталі ўзорам у абхазскай паэзіі. Дайшлі да Агумаа славутыя купалаўскія радкі верша «Беларускім партызанам». Як сведчыць жонка паэта, ён ведаў гэты верш напамяць. Раны, атрыманыя ў баях, хутка далі пра сябе знаць. У 1950 годзе К. Агумаа памёр.

Але вернемся на Каўказ.

У Тбілісі ведаюць Купалу і шануюць памяць аб ім. Сведчанне гэтага — шматлікія пераклады вершаў паэта на грузінскую мову. Любіў і Купала братнюю паэзію, з цікавасцю чытаў вершы грузінскіх сяброў. У 1940 годзе Янка Купала быў узнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Грузіі за папулярызацыю грузінскай літаратуры. І вось цяпер грузінскія сябры перадалі мне дублікат Ганаровай граматы (сам дакумент загінуў у час вайны) для захавання ў музеі песняра.

З дапамогай грузінскіх пісьменнікаў і работнікаў Дзяржаўнай бібліятэкі Тбілісі ўдалося знайсці невядомыя да гэтага часу выступленні Я. Купалы ў мясцовым друку і фотаздымкі паэта. Вялікую цікавасць уяўляе артыкул, змешчаны ў газеце «Заря Востока» ад 24 снежня 1937 года. Гаворачы пра сусветную каштоўнасць паэмы «Віцязь у тыгравай шкуры», Купала адзначае, што творчасць Руставелі зрабіла пэўны ўплыў на развіццё многіх братніх літаратур, у тым ліку і беларускай. Зусім невыпадкова асобныя раздзелы паэмы былі перакладзены на беларускую мову яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны.

Жывуць у Тбілісі сябры Купалы — вядомыя паэты З. Лордкіпанідзе і А. Кутатэлі. У свой час яны гасцявалі ў Беларусі. Пра гэтую сустрэчу мне расказаў А. Кутатэлі. Ён выказаў думку, што ў фондах Літаратурнага архіву Грузіі павінны быць пісьмы Янкі Купалы да сяброў. Але адразу, жартуючы, папярэдзіў, што перадаць іх, бадай, не будзе ніякай магчымасці, бо Купалу грузіны лічаць сваім паэтам. Што ж, гэта так. Купала належыць і армянам, і таджыкам, і латышам, і ўкраінцам... Ён назаўсёды пакінуў памяць аб сабе на зямлі братніх народаў.

Ілья КЛАЗ.

На здымку—Янка Купала з абхазскімі паэтамі К. Агумаа і Л. Квіцыніям.

К. АГУМАА

РАЗВІТАННЕ ВОІНА

Да спаткання, белы сад,
Мілы горад, да спаткання!
Пакідае вас салдат.
Час настаў выпрабавання.

Я іду Бяду забіць
У лясах, у чыстым полі.
Без Радзімы мне не жыць,
Мне няма жыцця без волі.

Конь стаіць мой пад сядлом,
Панясе мяне ён скора
Скрозь гарачы дым і гром...
Да спаткання, рэкі, горы!

Выс вецер.
Там і тут
Па-над доўгаю дарогай
З крыкам ластаўкі нясуць
Зразумелую трывогу.

Да спаткання, родны край!
Ты ў чужым краі далёкім
Кроч за мной і даглядай,
І сачы нябачным вокам.

І таму, зямля мая,
Не палохаюся смерці.
Колькі буду гінуць я,
Столькі раз магу ўваскрэсці!

Беларусь.
1943 г.

Л. КВІЦЫНІЯ

ТЫ КЛАПАТЛІВА ХОДЗІШ...

Ты клапатліва ходзіш ля гумна,
Тужыш, пазбыўшыся спакою,
мама?
Ты кожны дзень ад рання
да цямна
Усё чакаеш сына, мама?

Я меў бы моцны і спакойны сон,
Калі б я ведаў, што здарова,
мама,
Калі б прынёс мне вестку
паштальён,
Я зноў душой ажыў бы, мама.

О, ўбачыць мне, як зацвітае сад,
Як ты ідзеш па сцежцы, мама,
Або як даглядаеш вінаград—
Як было б сэрца сына рада,
мама.

А рукі працавітыя твае
Не ведаюць спакою, мама.
Спяваеш ты... І бачыш, як плыве
Дымок ад парахода, мама.

Як там айва, што пад акном маім,
Дзе мы з табой сядзелі, мама?
А кіпарыс? Ці шапаціць у ім
Ласкавы ветрык, мама?

Зірні ў пакой, дзе мой партрэт
вісіць,
Як і раней, твой сын смяецца,
мама...
Ты не бядуй і слёз не варта ліць,
Ён з перамогай вернецца
дадому, мама!

Беларусь.
1941 г.

Пераклады з абхазскай.

У Мінскім цырку паказваецца новая праграма «13 спатканняў». На арэне выступаюць ролікабежцы, жанглёры, акрабаты-прыгуны, эквілібрысты, танцоры. Вы бачыце артыста Луіджы Безана са сваім выхаванцам — дрэсіраваным мядзведзем.

Фота Ул. КРУКА.

ФЕСТЫВАЛЬ У ЖЫТОМІРЫ

Сем дзён працягваўся ў Жытоміры (Украінская ССР) фестываль аматарскіх фільмаў. Сюды прывезлі больш 200 работ кінааматары Масквы, Ленінграда, Рыгі, Каўнаса, Кішынёва, Тбілісі і іншых гарадоў краіны. Запрошаны былі і прадстаўнікі нашай рэспублікі. Беларускія кінааматары прывезлі ў Жытомір фільмы «На свяшчэнных руінах», «Вясна» і «Неспакойнае сэрца». Іх з цікавасцю прагледзелі ўдзельнікі фестывалю.

Ю. ПЯТРОЎ.

ПАПАЎНЕННЕ

Пры маладзечанскай раённай газеце «Святло камунізма» даволі актыўна працуе літаратурнае аб'яднанне. Тут часта абмяркоўваюць творы пачынаючых, лепшыя з іх друкуюць на старонках газеты.

Нядаўна да членаў аб'яднання прыйшла група навучэнцаў політэхнікума разам з выкладчыкам літаратуры А. С. Макоўскай. Яны расказалі прысутным аб сваім літаратурна-музычным клубе. На пасяджэнні літаб'яднання былі абмеркаваны творы навучэнцаў В. Ахрамеевай, Д. Буевай, Х. Казлоўскай і іншых.

Ул. МАНГІНОВІЧ.

ДЛЯ МОЛАДЗІ

«Мастацтва і час» — лекторый для моладзі пад такой назвай адкрыўся ў рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў.

Тэме «Савецкае мастацтва. Яго праблематыка і перспектывы» была прысвечана першая лекцыя, якую прачытаў доктар філасофскіх навук М. Круноўскі.

Занятні лекторыя будуць праводзіцца адзін раз у месяц. У праграме яго — лекцыі аб савецкай драматургіі, выяўленчым мастацтве, народнай песні, архітэктуры і г. д. Адбудуцца сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, мастакамі, драматургамі, вядучымі артыстамі тэатраў і кіно.

Для тых, хто наведвае лекторый, будуць арганізаваны экскурсіі ў тэатры і музеі Мінска.

Я. МАЛЫ.

З ВЫСТАЎКІ МАЛАДЫХ МАСТАКОЎ

В. БАБРОЎ. «Блакада» (масла).



КАСТРЫЧНІК НА ЗЫХОДЗЕ. У шпаноў чамаданны настрой.

Фотаэцюд К. ЯКУБОВІЧА.

СЕЗОН АДКРЫЛІ ЦЫМБАЛЫ

21 кастрычніка выступленнем цымбаліста Яўгена Гладкова адкрыла сезон канцэртная зала Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. Луначарскага.

У праграме канцэрта былі творы, якія рэдка выконваюцца на цымбалах або зусім на гэтым інструменце не выконваліся.

Сваё выступленне Яўген Гладкоў пачаў першай часткай Брандэнбургскага канцэрта № 4 Баха. У выкананні адчувалася глыбокая думка, вялікая культура і высакароднасць інтэрпрэтацыі. Багаццем гукаў, фарбаў і настрою вызначалася Ронда Капрычыоза Мендэльсона.

Пяшчотна спявалі цымбалы ў Накцюрне № 2 Шапэна. Легата гучала нават больш дасканала, чым пры ігры на фартэпіяна.

Прыгожа, тонка, строга акадэмічна была выканана «Кампанела» Паганіні. Асабліва цікавы пачатак. Спецыфічнае гучанне цымбалаў у верхнім рэгістры нагадвала гук званочкаў. Своеасаблівы тэмбр інструмента ўзбагаціў твор.

Вострым, тэмпераментным атрымалася «Цапатэада» Сарасатэ.

Другое аддзяленне адкрылася канцэртам Д. Камінскага. Своеасаблівую трактоўку надаў Я. Гладкоў другой частцы, дзе кантрастуюць дзве тэмы,—лірычная напеўная і жартаўлівая, пабудаваная на пругкім, спружынистым рытме.

У добрым тэмпе выканаў цымбаліст мініяцюры «Палёт чмяля» Рымскага-Корсакава і тры прэлюдыі Шастаковіча. Рускі танец Чайкоўскага і румынскія танцы Бартака захапілі слухачоў маляўнічасцю вобразаў, непасрэднасцю карцін народнага жыцця.

На «біс» саліст і канцэртмайстар Галіна Валкавіцкая сыгралі Капрыс Вяняўскага і Хора Стаката Дзініку.

Вельмі шкада, што ў праграме амаль не было твораў беларускіх аўтараў; ішоў жа цымбальны канцэрт...

З. НАСЦЕНКА.

ДАРАГІ ПАДАРУНАК

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца на Іванаўшчыне творы Фёдара Панфёрава. У 1960 годзе таленавіты савецкі празаік быў жаданым госцем працаўнікоў калгаса «Моладава», дзе праводзілася канферэнцыя чытачоў па яго раману «Роздум». Фёдар Іванавіч перадаў тады раённай бібліятэцы, якая носіць яго імя, звыш дзвюх тысяч сваіх кніг.

Нядаўна з Масквы ў бібліятэку прыйшла ёмістая пасылка з кнігамі Ф. Панфёрава. Яе прыслала іванаўцам жонка пісьменніка Антаніна Капцяева.

Ф. ГЛІНСКІ.

Іванаўскі раён.



У Мінску ў раёне парка Чалюскінцаў заканчваецца будаўніцтва крытага басейна.

Фота А. ЛАЎРЫНОВІЧА.

ЭКРАНІЗАЦЫЯ ЦІ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ?

РОЗДУМ РЭЖЫСЁРА НАД БУДУЧЫМ ФІЛЬМАМ

Кінарэжысёр Міхаіл Швейцэр—вучань вядомага майстра Міхаіла Рома. У якасці асістэнта ён працаваў разам з ім над карцінай «Чалавек № 217». Затым быў удалы дэбют—у садружнасці з Уладзімірам Венгераравым Швейцэр стварыў фільм «Корцік». Яго першая самастойная работа—стужка «Чужая радня» да гэтага часу застаецца адным з лепшых фільмаў пра вёску. Затым рэжысёр паглыбляецца ў творчасць Талстога. Двухсерыйны фільм «Уваскрэсенне» вылучыў Міхаіла Швейцэра ў рады лепшых савецкіх рэжысёраў. Апошні фільм «Час, наперад!» быў сустрэты з вялікай цікавасцю, выклікаў нямала спрэчак. Усе пагадзіліся з думкаю, што талент рэжысёра ўзмужнеў, умацаваўся.

Цяпер Міхаіл Швейцэр рыхтуецца да здымак шырокаэкраннага фільма «Залатое цяля» па аднайменнаму сатырычнаму раману І. Ільфа і Я. Пятрова. Карэспандэнт АДН папрасіў рэжысёра падзяліцца думкамі аб новай рабоце.

У нейкі момант усе мы адкрывалі і адкрываем для сябе «Дванаццаць крэслаў» і «Залатое цяля» Ільі Ільфа і Яўгенія Пятрова. Астап Бендэр і яго спадарожнікі захапляюць уяўленне чытача, надоўга застаюцца ў памяці. З імі, бадай, можа канкурыраваць хіба толькі славуты Швейк—таленавіты твор Яраслава Гашэка...

Думка аб пастаноўцы фільма «Залатое цяля» ўзнікла не цяпер. Яна нарадзілася так даўно, што ператварылася ў мяне ў назойлівую ідэю. Цяпер жа, калі поўным ходам ідзе работа, з'явіліся пакутлівыя сумненні, непазбежныя заўсёды, калі дакранаешся да таленавітага і папулярнага ў народзе твора. З многіх шляхоў увасаблення твора на экране трэба выбраць адзіны. Думаецца, што ў мяне ёсць пасля пастаноўкі «Час, наперад!» паўны вопыт паказу атмасферы жыцця краіны і народа канца дваццатых і пачатку трыццатых гадоў.

Раман настолькі папулярны, настолькі вядомы, а яго жанравая пэўнасць так умацавалася ў свядомасці, што будучая карціна ўяўляецца абавязкова адназначнай. Досціпы Астапа Бендэра, незвычайныя сітуацыі, у якія трапляюць героі рамана, афарызмы, смешныя сцэны—усё ясна! І тым не менш гледача і чытача рамана чакаюць нечаканасці. Чамусьці за шмат гадоў жыцця «Залатога цяля» ў свядомасці чытачоў — не ва ўсіх, але ў большасці—ад рамана захаваліся іменна гумарыстычныя, авантурныя бакі.

Але ў творы надзвычай моцны аўтарскі лірычны струмень, ёсць грамадзянска-патэтычная нота. І вось, будучы фільм бачыцца мне шырокім палатном, у якім натуральна сплятуцца рознажанравыя лініі: гумар, лірыка, эксцэнтрызм, патэтыка. Гэта не будуць анекдатычныя гісторыі Астапа Бендэра, а падрабязная ў своеасаблівым жанры размова пра жыццё, пра сур'ёзныя, іншы раз сумныя рэчы.

У пошуках кінаінтэрпрэтацыі твора нам хацелася б вызваліць фільм ад эпізодаў, якія ў рамане маюць цяпер ужо гістарычную цікавасць, ад сцэн, якія некалі былі надзённыя. І, наадварот, зрабіць акцэнт на тым, што сёння мае цікавасць, што можа стаць неабходным і надзённым для гледача. Гэта адносіцца і да драматургіі (адбор літаратурнага матэрыялу) і да трактоўкі вобразаў персанажаў і галоўнага героя.

Так, мы бачым Астапа Бендэра,—я б сказаў у ракурсе, які можа спалохаць чытача тым, што герой зласца сумным, — з яго філасофіяй, светапоглядам, з якімі мы спрачаемся і якія нават развенчваем. Аўтары рамана гэта зрабілі тактоўна, але настойліва. Яны прыводзяць Бендэра да тупіка, да той думкі, што жыццё пражыта марна, што жыццёвыя пазіцыі трэба пераглядаць.

Пытанні, якія стануць перад героем у фінале фільма, у той жа меры стануць і перад гледачом.

Экран быццам бы не ўступіць у спрэчку з поваду трактоўкі вобраза героя, якая мае доўгую і заблытаную гісторыю. Але ўнутраная спрэчка немінучая, скажам, з трактоўнай вобраза Астапа ў тэатры сатыры. Нам хацелася б пакласці ў аснову або стварыць трошкі іншую прыроду смеху, чым тая, якою карыстаюцца ў тэатры.

Вельмі важна ў канцы фільма высветліць не тое, што Астап Бендэр не можа згубіць мільён. Нас хвалююць маральна-этычныя вытокі, якія і аднінулі Астапа Бендэра ў бездань адчужэння, непрымання. Ён не можа, маючы мільён, авалодаць чалавечым сэрцам, яму не ўдаецца камандаваць парадам, да чаго ён так імкнуўся, спадзеючыся на грошы як на сродак для дасягнення гэтых мэт. Ён не набывае ні павагі, ні любві, ён не атрымлівае ні дружбы, ні ўлады.

У той самы момант, калі Астапу на Турксібе ў душным вагоне падпольны мільянер уручае грошы, пачынаецца пераражэнне, герой робіцца больш сумным. На першы план быццам выходзіць тэма Фаўста—герой расплачваецца за свае жыццёвыя пазіцыі. Ён дае Шуру Балаганаву пяцьдзесят тысяч рублёў, але той квапіцца на звычайную жаночую сумачку, і Астап не можа яго выратаваць. І сустрэча з моладдзю ў цягніку, са студэнтамі і з Зосяй заканчваецца крахам.. Гэта адзін з прыкладаў нашай трактоўкі рамана.

Ад акцёраў спатрэбяцца вялікія творчыя намаганні. Эксцэнтрыка, гратэск у вырашэнні эпізодаў павінны працаваць на перакананаўчасць фільма. І не проста перакананаўчасць, але і гранічна рэалістычную праўду часу, яго атмасферу. Акцёрская маска выключана. Глядач павінен убачыць жывых людзей. Мы хацелі б зняць эксцэнтрычны фільм, але так, каб яго атмасфера і самі акцёры ўспрымаліся сапраўднымі, як у жыцці, што непасрэдна нас акружае. Эксцэнтрызм акцёрскага выканання павінен узнікаць не з умоўных паводзін, а з захопленасці героямі сваёй задачай.

Адно з самых цяжкіх пытанняў мастацтва—гэта натуральнае спалучэнне ўмоўнага і рэальнага: натуры, дэкарацыі, рэальных сітуацый, рэалістычных сцэн і эпізодаў з эксцэнтрыкай унутранага стану персанажаў. Трэба будзе знітаваць у адзіную мастацкую тканіну анамаліі чалавечага характару і бытавога, звычайнага асяроддзя.

І апошняе, на чым хацелася б спыніцца. Раман вытрымаў экзамен на жыццё і не патрабуе мадэрнізацыі. Але ёсць рэальная небяспека адыходу ў гістарычны бытавізм. Не трэба адгароджваць гледача ад экрана рэквізітам, грымам, усялякімі прыкметамі часу, якія, здавалася б, дакладна адпавядаюць адлюстроўваемай эпосе. Як мага менш гэтых перашкод, гістарычных, рэчавых пераробак. Як мага больш таго, што збліжае экран і гледача.

Празмерныя клопаты аб касцюме, грыме, рэквізіце могуць выклікаць у гледача думку: «Гэта было, і да мяне мае малое дачыненне». Такі аншлаг прыкмет часу, як гэта ні дзіўна, здольны часам забіць у фільме мастацкую перакананаўчасць. Калі стаіць задача адбору варыянтаў касцюма, грыму, натуры, дэкарацыі, якія зроблены ў рамцы адной і той жа эпохі, мяне вабіць варыянт найменш гістарычны, найбольш сучасны. З дзвюх фуражак эпохі мінулага будзе выбрана тая, якая бліжэй да нашага сучасніка.

Леў Талстой пры ўсёй сваёй непаўторнай канкрэтнасці дае мясцовы і гістарычны каларыт так празрыста, так неназойліва, што чытач у падзеях вайны з Напалеонам пазнае салдат севастопальскай вайны, у персанажах мінулага ўлоўлівае рысы людзей шасцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя, сучаснікаў Талстога. Чытач адчувае ў героях, падзеленых вялікім адрэзкам часу, псіхалогію людзей шасцідзесятых, сямідзесятых гадоў, праблем жыцця, якія на працягу ўсяго вялікага жыцця хвалявалі Талстога. І толькі, магчыма, пасля трэцяга чытання рамана «Вайна і мір» заўважаеш паўлаўскую коску старога князя Балконскага...

На сваім вопыце я пераканаўся, што ў кіно гэтая задача наближэння мінулага да нашых дзён надзвычай цяжкая. Таму і даводзіцца шмат думаць пра тое, як наблізіць раман да сучаснасці.

Нашы здымкі, як заўсёды, мы пачнём з самых складаных масавых сцэн. Гэта будзе ўрачысты, святочны эпізод змычкі новай чыгункі—Турксіба—са старой чыгункай. У гэты патэтычны момант адбудзецца сустрэча двух нашых камбінатараў... Работа наперадзе вялікая, але цікавая.

Міхаіл ШВЕЙЦЭР,
заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР.

Наша госці: СТАЛАСЦЬ КАЛЕКТЫВУ

Заслужаны калектыў УССР Дзяржаўны сімфанічны аркестр Украіны знаёмы нам па ранейшых канцэртах у Мінску. Гэта адзін з лепшых калектываў Саюза. Яго нядаўнія справаздачныя выступленні ў Маскве, Ленінградзе, Рызе, Таліне, Вільнюсе прайшлі з вялікім поспехам. Добрае ўражанне пакінулі ўкраінскія музыканты і ў мінчан.

Дзве праграмы, выкананыя ў Мінску, сведчаць аб шырокім творчым дыяпазоне аркестра, аб яго сталасці.

Цудоўна паказала сябе струнная група. Гранічнай насычанасці і выразнасці яна дасягнула ў Шостай сімфоніі Чайкоўскага і выкананай на «біс» уверцюры да оперы «Тарас Бульба» Лысенкі. Добрыя ансамблі ўнутры аркестра. Рэльефна чуваць асобныя групы ў квінтэце, у сярэдніх рэгістрах у другіх скрыпак і альтоў. У акордавых спалучэннях здзіўляе чысцінёй ладу драўляная духавая група. Яна гучыць вельмі мякка. Шмат цёплых слоў можна сказаць пра выкананне сольных месц у Шостай сімфоніі Чайкоўскага флейтыстам А. Сямёнавым, фагатыстам В. Івановым і кларнетыстам В. Ціхановым.

Тонкая фразіроўка, уменне «накласці» патрэбную фарбу сведчаць пра высокі прафесіяналізм салістаў аркестра. У скерца драўляныя паспяхова спаборнічалі з тэхнічным майстэрствам струнных.

Роўна, без трэску гучыць медная група.

Аркестр можа раскрыць любую сімфанічную партытуру.

Мы невыпадкова пачалі з артыстаў аркестра. Ад іх залежыць многае, каб не сказаць усё. А высокі прафесіяналізм аркестрантаў і яркая індывідуальнасць дырыжора — тое, што вылучае аркестр нашых сяброў.

Дырыжор С. Турчак — яркі і таленавіты музыкант, вельмі эмацыянальны і тэмпераментны. Яго жэст просты і ясны, ён заўсёды ідзе ад зместу музыкі.

Мяркуючы па праграме, С. Турчаку больш блізкі Чайкоўскі. З вялікім уздымам дырыжор правёў Шостую сімфонію. Ён здолеў раскрыць яе захапляючы драматызм і філасафічнасць. Асабліва пераканаўча гэта ўдалося яму ў першай і чацвёртай частках. С. Турчак пазбег штампаў, якія ўкараніліся ў трактоўках гэтага твора. Мы не пачулі «надрываў» і захлынальных «страсцей» у фінале. Квінтэт спяваў высакародна і мужна. У цэлым сімфонія прагучала як роздум пра жыццё чалавека і сэнс яго існавання, як апавяданне пра яго барацьбу, не толькі жорсткую, але і цудоўную, поўную шчасця і святла. Дырыжор добра адчувае вакальную напеўнасць і выразнасць музыкі Чайкоўскага. Шмат цікавых творчых знаходак было ў распрацоўцы першай часткі сімфоніі.

Светла і ясна прагучала Восьмая сімфонія. Трактоўку дырыжора вызначала цэласнасць задумы. Ён падкрэсліў мужнасць і суровасць твора. Але тут было менш творчай інтэрпрэтацыі, адчувалася пэўная традыцыйнасць.

Лаўрэат міжнародных конкурсаў Алег Крыса — бліскучы скрыпач-віртуоз. Цёпла і пранікнёна ён сыграў Канцэрт Бетховена. Але не ўсё выканаўца раскрыў да канца ў гэтым цяжкім для скрыпачоў творы. Бо апроч тэхнічнай сталасці і прыгожага гуку, п'еса патрабуе маштабнасці і глыбіні мыслення. Гэтага якраз у выкананні неставала.

У другім канцэрце дырыжыраваў малады і здольны музыкант Уладзімір Кажухар. Ён вельмі сур'ёзна правёў цяжкую праграму (Другая сімфонія Рэвуцкага, сюіта з балета «Жарптушка» Стравінскага, уверцюра да оперы «Іфігенія ў Аўлідзе» Глюка), паказаўшы добрую дырыжорскую тэхніку, волю і тэмперамент. Думаецца, што з часам у яго з'явяцца таксама артыстызм і мастацкая сталасць.

Лаўрэат Міжнароднага конкурсу піяністаў Яўген Ржанаў выканаў Трэці канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Пракоф'ева. Іграў ён смела і ўпэўнена, перадаўшы не толькі такатнасць і маторнасць пракоф'еўскіх інтанацый, але і іх пранікнёную тонкую лірыку.

Пачуцці мінскіх слухачоў выказаў пасля канцэрта народны артыст СССР Рыгор Шырма. Ён шчыра падзякаваў украінскім артыстам за высокае майстэрства выканання.

Г. ГЛАЙХЕНГАУЗ.

А ШТО СКАЖА МАШЫНА?..

Забытае апавяданне Талстога. Знойдзены рукапіс Дастаеўскага. Невядомая аповесць Ганчарова. Неапублікаваныя пісьмы Горкага. Ды хіба магчыма гэта ў наш час, калі вывучана амаль кожнае слова класікаў літаратуры?

Аказваецца, магчыма.

Дзесяткі вучоных-літаратуразнаўцаў шукаюць і пісьмы, і аповесці, і вершы класікаў. Пошукі гэтыя поўныя часам такіх цікавых прыгод, што ім пазайздросціў бы іншы стваральнік дэтэктыўных раманаў і аповесцей.

Вось я і хачу расказаць пра тое, як быў знойдзены невядомы твор Антона Паўлавіча Чэхава.

Я перачытваў тамы твораў Чэхава, часопісы з публікацыямі забытых яго твораў. І раптам у вочы кінулася фраза ў адным з апавяданняў: граф Каліостра «пераўзышоў вынаходніка мазі Іванова: вынайшаў элексір даўгалецця і любоўны напітак». Фраза нечым зацікавіла мяне.

Іншы раз мільгане ў галаве якінебудзь вобраз, прозвішча. Мільгане і засядзе. Не хутка адчэпішся ад вобраза ці слова, што запала ў свядомасць. Так здарылася і цяпер. Фраза пра мазь Іванова не выходзіла ў мяне з галавы: у якім апавяданні я сустракаў яе. А раптам гэта фраза з якога-небудзь ананімнага апавядання, якое на самай справе належыць пяру Чэхава.

Якраз перад гэтым у бібліятэцы імя Ул. І. Леніна я праглядаў камплекты часопіса «Зритель», у якім супрацоўнічаў малады Чэхаў.

Пішу ў бібліятэку, прашу сфатаграфаваць камплект «Зрителя». Хутка з Масквы прыслалі сем метраў фотаплёнкі — каля трохсот кадраў. Кадр за кадрам праглядаю плёнку праз аб'ектыў фотапавелічальніка. Гэта былі дні чаканняў, расчараванняў, дні прагі знаходак і пачырванелых ад напружання вачэй. Амаль усе кадры прачытаны. Трацяцца апошнія крупінкі надзеі. І раптам у ілюстраваным апавяданні «Мая сям'я» я знаходжу тое, што шукаў так настойліва. Тры калонкі ўборыстага тэксту, дзесяць невялікіх малюнкаў — адлюстраванне персанажаў. Чытаю:

«Мая сям'я

(бясплатны дадатак да прашэння аб дапамозе). **Цесць** Емяльян Сідаравіч — адстаўны гардэмарын. Малога росту, худы, маршчыністы, але ўнушальны. Нарадзіўся ў Кранштаце. Гаворыць, што купаўся ў акіяне. Знаходзячыся ў Канстанцінопалі, бачыў султана. З часоў адстаўкі шукае месца ўпраўляючага домам або маёнткам. Не любіць непрадказуй і вечна чытае мне натацыі за неахайнасць. Устае ў чатыры гадзіны і сам чысціць сабе боты. Кладзецца ў восем гадзін. Спіць у гасцінай. Вечарам доўга моліцца ў маім кабінеце, прычым загадвае мне стаяць і не курыць...»

Далей пералічваюцца рысы характару братоў, сёстраў, цешчы Глафіры Кузьмінічны:

«Цешча — слязлівая, багамольная, маральная і разам з тым у вышэйшай ступені ядавітая істота. Скардзіцца ўсім і кожнаму, што яе бог пакрыўдзіў зяцем. Любіць цыкорную каву, смятану і рыбку. Мяса не есць: абяцанне дала. Даўно ўжо збіраецца паміраць, але не памірае. Прыходзіць у госці. Мяне велічае «какаянным». Мяне? Хіба я яе не кармлю? Хіба я не цярплю яе штодзённых гаворак пра тое, што яна чай без хлеба есць? Хіба я не даю ёй грошай на мазь Іванова.. якою яна па начах націрае сабе паясніцу?»

Вось яна, фраза, якая так непакоіла мяне. І нездарма. Чым больш я ўчытваюся ў апавяданне, тым часцей сустракаю знаёмыя звароты мовы Чэхава. Няўжо і гэтая рэч належыць яму? Чаму ж ён не падпісаў яе якім-небудзь са сваіх псеўданімаў?

Звяртаюся да зместу часопіса. Шукаю назву апавядання: «Мая сям'я—СБЧ». Яшчэ адна загадка! Звяртаюся да каталогаў, шукаю ў іх літаратара, прозвішча якога пачыналася б на «Ч», а імя, імя па бацьку ініцыяламі «С.Б.». На жаль, няма ні псеўданіма, ні аўтара з падобнымі ініцыяламі...

Але ж малады Чэхаў падпісваў некаторыя апавяданні псеўданімам «Чалавек без селязёнкі», або скарочана — «Чел. без с.». А апавяданне «Патрыёт сваёй айчыны» ў часопісе «Мирской толк»—трыма загалоўнымі літарамі—«ЧБС». Але ж тут тыя літары, толькі чытаць іх трэба ў адваротным парадку — СБЧ! Як жа гэта я адразу не здагадаўся! Такім чынам, зусім відавочна, што «Мая сям'я» апавяданне Чэхава, а «СБЧ» — яшчэ адзін з яго псеўданімаў.

Знойдзенае мною апавяданне было апублікавана ў зборніку «Литературное наследство» Акадэміі навук СССР. Рэдакцыя не была цвёрда ўпэўнена, што «Мая сям'я» — гэта, безумоўна, чэхаўскі твор і змясціла матэрыял пад рубрыкай — «Мяркуемы фельетон Чэхава».

Ці можна лічыць загадку разгаданай, а пошукі закончанымі? Я зрабіў вывад, што вялікую паслугу тут можа аказаць вылічальна-электронная машына.

Кожны пісьменнік валодае сваім моўным стылем. І вось, калі ўстанавіць асаблівасці гэтага стылю, яго адценні, падлічыць частату ўжывання пэўных прыназоўнікаў, злучнікаў, дзеясловаў у апавяданні «СБЧ», а потым у аналагічных апавяданнях Чэхава гэтых жа гадоў, дык стане зразумела, чый гэта стыль. Такая «саматужная» работа зойме, бадай, не адзін тыдзень. А чаму ж не зрабіць гэта з дапамогай вылічальна-электроннай машыны? Усё будзе хутчэй і дакладней Машына адкажа на пытанні: ці з'яўляецца Чэхаў аўтарам апавядання «Мая сям'я»?

Калі пачаўся новы навучальны год, на філалагічным факультэце Кішынёўскага універсітэта была арганізавана «Чэхаўская група». Дванаццаць студэнтаў атрымалі канкрэтнае заданне: па фотакопіях часопісаў 80-х гадоў, зробленых бібліятэкай імя Ул. І. Леніна, дасканала вывучыць стыль ранніх твораў Чэхава: вызначыць колькасныя суадносіны ў яго апавяданнях часцін мовы, членаў сказа, аж да знакаў прыпынку. Студэнткі Г. Рагавая і Л. Васільева ўзяліся разам з тым вызначыць моўную структуру і іншых невялікіх твораў, аўтарства якіх прыпісвалася Чэхаву. А студэнтка Н. Казак распачала работу над дыпломным праектам на тэму «Лексіка-сінтаксічны метад вызначэння аўтарства Чэхава паводле апавядання «СБЧ» «Мая сям'я». На аснове яе даследавання складаецца праграма для вылічальнай машыны, якая і правядзе падлікі.

Барыс ЧЭЛЫШАЎ,
дацэнт Кішынёўскага універсітэта
(АДН).

У Мінску на гастролях знаходзіцца эстрадны аркестр Лейпцыгскага радыё (ГДР). З аркестрам выступаюць спевакі Рэх Дэмон і Хельга Браўэр. Мастацкі кіраўнік і дырыжор—Вальтэр Айхенберг. Беларускія гледачы з вялікай цікавасцю сустрэлі гастролі нямецкіх гасцей.

ПОМНІК АХВЯРАМ АСВЕНЦІМА

На былой тэрыторыі канцлагера Асвенцім, паміж руінамі двух крэматорыяў, узводзіцца цяпер вялікі помнік ахвярам фашызму — чатыром мільёнам закатаваных і спаленых гітлераўцамі вязняў лагера. У збудаванні помніка прымаюць удзел многія краіны Еўропы. У Міжнародным асвенцімскім камітэце ў Варшаве мне расказалі, што цэнтральнай часткаю помніка будзе скульптура, складзеная з каменных глыб, якія нагадваюць знявечаныя болем твары людзей і вялізныя саркафагі. Паабапал помніка высунуцца рады бетонных слупоў, якія ў мінулым агароджвалі крэматорыі, што працавалі ўдзень і ўначы. Плошча перад скульптурай пакрыецца гранітнымі плітамі ў выглядзе тэрас. Яна будзе служыць месцам для дэманстрацый.

Творчае кіраўніцтва будаўніцтвам міжнароднага помніка ахвярам Асвенціма ажыццяўляе прафесар Юзэф Патэмпа.

Закончыць будаўніцтва помніка мяркуецца да 22-й гадавіны вызвалення лагера Савецкай Арміяй.

Віктар КУЗНЯЦОЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Варшава.

У СТРАХУ ПЕРАД ПЕСНЯЙ

Італьянскае тэлебачанне адмовілася прапусціць у эфір песню, якую вядомы эстрадны спявак Джані Марандзі павінен выконваць на «Фестывалі руж». Прычына гэтага — у тэксце песні гучыць рэзкі пратэст супраць вайны ў В'етнаме. Цэнзары тэлебачання запатрабавалі змяніць тэкст, каб «не парушаць грамадскага парадку».

У песні «Быў адзін хлопец, якому, як і мне, падабаліся бітлы» (музыка маладога кампазітара Маура Лузіні, тэкст Франка Мільячы) расказваецца пра амерыканскага хлопца, які праводзіў адпачынак у Італіі, потым быў адазваны ў ЗША і адпраўлены ў В'етнам. Як піша газета «Уніта», гэта першы выпадак, калі ў эстраднай песні проста, без пацыфісцкай шырмы гаворыцца пра вайну ў В'етнаме. Прадстаўнікам тэлебачання не спадабаліся такія радкі: «Мне сказалі, адпраўляйся ў В'етнам і страляй па В'етконгу...», «І скончыў тым, што паехаў ваяваць у В'етнам...», «Цяпер ён загінуў у В'етнаме...» Яны патрабавалі змяніць тэкст, заявіўшы, што ў адваротным выпадку не будуць трансліраваць па тэлебачанні адборачны конкурс «Фестывалю руж».

Яшчэ адна песня, якую павінен выконваць Бобі Крыспіана, прыйшлася не да спадобы гаспадарам блакітнага экрана. У гэтай песні «Брэнерскі перавал 66» гаворыцца пра смерць салдата ад рук тэрарыстаў. На тэлебачанні запатрабавалі змяніць назву песні і замяніць радок «Ты загінуў недарэчнай смерцю» чым-небудзь накшталт «Ты памёр у цішыні...»

Калі ўсё ж адбыўся першы тур «Фестывалю руж», прысутныя з вялікай цікавасцю чакалі, які выгляд прыме песня Джані Марандзі ў тых месцах, дзе ўпаміналася пра В'етнам. Але спявак, таксама як і аўтар тэксту, які не пажадаў мяняць слоў, проста напяваў «тра-та-та-та». Нягледзячы на такія купюры, песня захавала сваю сілу. Калі Марандзі спявае: «Не гучыць мая гітара, а гучыць іншы інструмент, які заўсёды паўтарае адну ноту», ударнік імітуе аўтаматную чаргу. А за гэтым ідуць словы: «У грудзях у яго ўжо няма сэрца, затое на іх прышпілены два ці тры медалі».

Аўтар тэксту Мільячы сказаў з гэтага поваду: «Мяне прымусілі не гаварыць пра В'етнам, я гэта зрабіў. Але калі чакалі, што я змяню тэкст, дык памыліліся. Цяпер песня стала дзіўнай. Але, прынамсі, людзі будуць пытаць у сябе, чаму гэта адбылося».

Наталля ЗІНОЎЕВА,
карэспандэнт ТАСС.

Рым.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 кастрычніка

Першая праграма. 16-45 — праграма перадач. 16-50—для школьнікаў. Канцэрт дзіцячага ансамбля народных інструментаў «Тарафа». Перадача з Кішынёва. 17-20 — «Сельская навіна». Перадача з Сімферопаля. 17-50—«Трывога». Тэлевізійная навела (М). 18-00—тэлевізійныя навіны. 18-20—вывучаючым марксісцка-ленінскую тэорыю. Асновы палітычных ведаў. Перадача другая. «Палітычная аснова савецкага грамадства. Камуністычная партыя—кіруючая сіла савецкага грамадства» (М). 18-50—для школьнікаў. «Сонечны скарб рэспублікі». Навукова-пазнавальная перадача. 19-10—для малышоў. «Пра тое, як». Музычны фільм. 19-20—да 50-годдзя Савецкай улады. «Час, наперад!». Мастацкі фільм. Першая серыя. Вытворчасць кінастудыі «Масфільм». 20-30 — тэлевізійныя навіны (М). 21-00—«Час, наперад!». Мастацкі фільм. Другая серыя. 22-20—«Навіны мастацтва».

Другая праграма. 11-00—тэлевізійныя навіны (М). 11-20 — «Подзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 11-55 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Музычны церамок». Перадача з Пярмі. 18-00 — тэлевізійныя навіны (М). 18-20—праграма навукова-папулярных фільмаў. «У інстытуце імя Філатава». «Як важна берагчы скуру». Кінанарысы. 18-50—«Музычны маяк» (М). 19-00—тэлевізійныя фільмы Фрунзенскай студыі тэлебачання. Да 40-годдзя з дня ўтварэння Кіргізскай ССР (М). 19-30—тэлевізійны спектакль (М). 20-30—«Спявае Б. Гмыра». Фільм-канцэрт. 21-00—для юнацтва. «Шукальнікі». Перадача з Краснадара. 21-50—«Што трэба пакупніку». Рэпартаж з кірмашу аптовага продажу тканін і абутку (М). 22-10—па старонках часопіса «Октябрь» (М).

26 кастрычніка

Першая праграма. 16-05—праграма перадач. 16-10—школьная фільматэка. «Яўгеній Анегін». Фільм-опера. 18-00 — «Інтэрпрэсфота-66». Рэпартаж з Цэнтральнай выставачнай залы (М). 18-30—«На варце правапарадку». Пра работу органаў міліцыі, суда і пракуратуры. 19-00—канцэрт (М). У перапынку—тэлевізійныя навіны (М). 21-40—да 50-годдзя Савецкай улады. «Мой горад». «Тут пачынаўся Мінск». Пра мінулае, цяперашняе і будучае Фрунзенскага раёна сталіцы. 22-20—«Купалаўцы танцуюць і спяваюць». Песні і танцы са спектакляў Беларускага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы.

У дапамогу завочнікам. (Для студэнтаў вну).

23-10—«Вышэйшая матэматыка» (для II курса). 23-40—«Начартальная геаметрыя».

Другая праграма. 16-50 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17-20—«Час і людзі». Перадача са Свярдлоўска. 18-00—«Горад у рабочай спяцоўцы». Кінанарыс. 18-30—«Панарама Радзімы» (М). 19-00—«Клічуць вячэрнія агні». Расказ пра 1-ы рабочы інтэрнат Мінскага аўтазавода. 19-30—«Рэмбрант». Тэлевізійны спектакль. 21-20 — маленькі канцэрт. 21-40—тэатр тэлевізійнай навелы. Д. Лучанінаў. «Асенняя песня» (М). 22-20—Усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. Выступленне калектываў мастацкай самадзейнасці Валагодскай вобласці (М).

27 кастрычніка

Першая праграма. 16-05—праграма перадач. 16-10 — школьная фільматэка. «Пушкін». Дакументальны фільм. 16-50—для дзяцей. «Мікіта Кажамяка». Мультыплікацыйны фільм (М). 17-10—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Мядзведзяня Віні Пух і ўсе іншыя». Лялечны спектакль. Перадача з Ленінграда. 18-00—«Свет сёння» (М). 18-25—кінапраграма (М). 20-30—тэлевізійныя навіны (М). 21-30—«Дзённік пяцігодкі». Дзень 300-ы. 22-30—«Народны артыст СССР Барыс Андрэеў». Кінанарыс. 22-50—па вашых просьбах. Канцэрт.

Другая праграма. 11-00—тэлевізійныя навіны (М). 11-15 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 18-10—«Чалавек і атам». Навукова-папулярны фільм. 19-10—«Сэрца не забывае». Кінанарыс. 19-30—Б. Нушыч. «Звычайны чалавек». Тэлевізійны спектакль. 21-00—«Арэнбургская пуховая хустка». Кінанарыс. 21-30—вечар аперэты. Перадача з Балгарыі. 22-15—у эфіры «Маладосць». «Арбіта» (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Г. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

РАБОТНІКІ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ!

УСЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ СУВЯЗІ І «САЮЗДРУКУ» ПРЫМАЮЦЬ ПАДПІСКУ НА

«НАСТАЎНІЦКУЮ ГАЗЕТУ»

На сваіх старонках «Настаўніцкая газета» будзе сістэматычна асвятляць важнейшыя пытанні навучання і выхавання школьнікаў, практыку работы перадавых школ, гарадскіх і раённых аддзелаў народнай асветы, друкаваць нарысы пра настаўніцкае майстэрства, матэрыялы па методыцы выкладання школьных дысцыплін, па вядзенню пазакласнай работы і іншых важнейшых тэмах жыцця школы. Выпісаная вамі «Настаўніцкая газета» стане добрым памочнікам у штодзённай вашай рабоце

«Саюздрук» Міністэрства сувязі БССР.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культ